20 кастрычніка 2017 | № 39 (553)

# Новы час

novychas.by

• КУЛЬТУРА • ГРАМАДСТВА • ЭКАНОМІКА
• ЛЮДЗІ • ПАДЗЕІ • ФАКТЫ

ISSN 2218-2144

**Галівуд, гармоны і палітыка**

Стар. 8

**4 ЮРЫ ХАШЧАВАЦКІ: «Я МОГ СТАЦЬ МІЛЬЯНЕРАМ»**

Вядомы рэжысёр, гуру беларускай дакументалістыкі Юры Хашчавацкі 18 кастрычніка адзначыў сваё 70-годдзе



**6–7 АЛЕСЬ ЗІМНІЦКІ: «ГЕРОЕМ БЫЦЬ НЕСКЛАДАНА»**

Інтэлігенты высокі юнак, нечым падобны да герояў Рэмарка, пасля выхаду з СІЗА вярнуўся да музейнай працы і намагаецца наспець аформіць новыя вітрыны

**9 НАШЫ Ў ЧЭХІІ, АБО ВЯРТАННЕ БОРМАНА**

Лідар беларускай Партыі аматараў піва, вярнуўся ў палітыку. Праўда, пакуль у чэшскую

PIRÁTSKÁ STRANA

**10 «КАБ НІВОДНАГА КУЛАКА НЕ ЗАСТАЛОСЯ...»**

«Пошук ворагаў у калгасах» — так афіцыйна называліся масавыя рэпрэсіі сярод сялян, служачых і інтэлігенцыі



Калаж budzma.by

# Маўчанне — ужо не золата

## Альбо прафесійнае войска, альбо ніякага



Сяргей ПУЛЬША

Забойства (сёння мы ўжо дакладна ведаем, што гэта забойства, і не важна, якую трактоўку дасць Следчы камітэт) у вайсковай частцы ў Печах Сашы Коржыча ўскрыла вялікі гнайнік беларускага войска.

Шмат гадоў адказныя асобы Мінабароны казалі нам пра «перамогу над дзедаўшчынай». На жаль, гэта былі толькі казкі.

Пытанняў у гэтай сітуацыі застаецца шмат, але ўсё ж галоўныя — да грамадства. Чаму самі салдаты і іх бацькі, якія, аказваецца, ведалі пра дзедаўшчыну, маўчалі? Чаму толькі смерць Коржыча выклікала лавіну інфармацыі пра тое, што творыцца ў войску, прычым, не толькі ў Печах? Чаму мы самі дазвалялі сабе расказваць байкі пра «выкараненую дзедаўшчыну» і самі ж у гэтыя байкі верылі?

Мы да канца яшчэ не асэнсавалі: свет змяніўся. І ў гэтым змененым свеце маўчанне — ані кропелькі не золата. Канешне, шмат хто верыць: ён змаўчыць — і, прынамсі, не будзе горш. Некаму сорамна прызнацца, што з імі было ў войску. Хтосьці не хоча сабе нашкодзіць. Але асноўны чыннік маўчання — страх. Страх і нявер'е ў тое, што агалоска злачынстваў дасць нейкі плён.

Але, як вядома, беспакаранае злачынства спараджае новае злачынства. А страх і маўчанне даводзяць да смерцяў. Цікава, як пачуваюцца зараз тыя, хто ведаў пра сітуацыю ў Печах? У іх няма адчування, што вінаватыя ў смерці Коржыча і яны таксама? Таму што маўчалі...

Канешне, пытанні ўзнікаюць і да вышэйшага кіраўніцтва як войска, так і краіны. За адстаўку міністра абароны Андрэя Раўкова за пару дзён было сабрана 11 тысяч подпісаў. Але знайшліся і тыя, якія лічаць, што міністра абароны ў адстаўку адпраўляць не трэба. Маўляў, ён першы менавіта беларускі кіраўнік войска, і гэта ўсё апраўдвае.

А між тым, бацькі іншага забітага ў маі (!) у Печах салдата былі ў гэтага міністра на прыёме і распавялі яму пра жахлівае становішча ў частцы. Аднак «беларускі» міністр за паўгода і пальцам не паварушыў, каб разабрацца і прадухіліць новую трагедыю.

Апроч таго, трое салдат з той жа часткі (адзін — з-за спробы суіцыду) былі адпраўленыя ў мінскі псіханеўралагічны дыспансер.

Шчыра кажучы, я таксама супраць, каб Раўкоў сыходзіў у адстаўку. Але зрабіў тое, што на яго месцы павінен зрабіць афіцэр.

Бо размова ідзе не пра дзедаўшчыну — гэта ўжо не пару сінякоў навaслужачым. Размова ідзе пра стварэнне ў войску арганізаванай злачыннай групоўкі, якая займалася катаваннямі і вымагальніцтвам. «Дзяды» здзекаваліся з шарагоўцаў і дзяліліся «хабарам» з камандзірамі. Сяржанты скуплялі скрадзеныя ў «духаў» тэлефоны і «дамаўляліся» з афіцэрамі. Камандаванне часткі пакрывала злачынцаў, а на выкладзеныя яму факты Раўкоў не рэагаваў. Бяздзеянне міністра абароны ў адказ на зварот да яго бацькоў — гэта ўжо не проста «халатнае стаўленне да службы» (артыкул 456 Крымінальнага кодэкса).

**Размова ідзе пра стварэнне ў войску арганізаванай злачыннай групоўкі, якая займалася катаваннямі і вымагальніцтвам**

Увогуле, знаўцы знойдуць дзясяткі артыкулаў, па якіх у гэтай сітуацыі можна прыцягваць афіцэраў да крымінальнай адказнасці, прычым па «цяжкіх» артыкулах. Бо, па-першае, наступствы іх учынкаў цяжкія, а па-другое, усе гэтыя злачынствы былі здзейсненыя «людзьмі ў пагонах», то бок з выкарыстаннем свайго службовага становішча.

Тое, што гэтая сітуацыя ўскрылася, прымусіла нас чарговым разам разважаць наконт рэформаў у арміі і ўвядзення прафесійнага войска.

Насамрэч, вайсковы прызыў — гэта перажытак часоў СССР. Гэта ў вялікай краіне — 1/6 часткі Зямлі — можа быць прызыўное войска і патрэба паставіць пад ружжо велізарную колькасць байцоў, каб перамагчы не ўменнем, а колькасцю. Беларусь жа, па еўрапейскіх паказчыках, краіна сярэдняя, і пры гэтым кампактная. Пры сучасным стане вайсковай тэхнікі нашу рэспубліку ад адной мяжы да другой на танку можна праехаць за суткі. Будзем казаць шчыра: у такіх умовах мы проста не паспеем правесці мабілізацыю і выдаць зброю. Пры маштабным нападзе ў тры гадзіны раніцы танкі будуць на мяжы, а ўжо ўдзень — у Мінску.

Таму нам наўрад ці патрэбны прызыў, мы ім проста не зможам скарыстацца. Нам патрэбна альбо народнае апалчэнне, па прыкладзе Швейцарыі, альбо прафесійнае войска.

Некаторыя аналітыкі заенчылі: прафесійнае войска занадта дарагое, наша дзяржава яго не пацягне фінансава. Але, па-першае, ніхто не лічыў, колькі нам каштуе сённяшняе войска з улікам ускосных стратаў: колькі грошай мы губляем, вырываючы з грамадства і вытворчасці працаздольных юнакоў і маладых спецыялістаў. Па-другое, колькі каштуе жыццё салдата, забітага «дзядамі»? Па-трэцяе, і галоўнае: войска патрэбнае, каб абараняць краіну. Ці будзе яе абараняць прыніжаны, згвалтаваны і прыгнечаны салдат? Пытанне, падаецца, рытарычнае.

Так што выбар у нас ужо не паміж прызыўной і кантрактнай арміяй. Выбар паміж прафесійнай арміяй і адсутнасцю арміі ўвогуле. Бо сённяшняе войска нас абараніць наўрад ці ў стане. А таму, лічыце, што яго няма.

# «Беларусь можа назаўжды страціць сваіх людзей»

**Прафсаюзны лідар патлумачыў, чаму беларусы едуць у Польшчу, а кітайцы — у Беларусь.**

Па статыстыцы, якую апублікавала МУС, толькі за студзень-верасень гэтага года больш за 8 тысяч беларусаў знайшлі працу за мяжой (часцей за ўсё ў Расіі і Польшчы). У той жа час у Беларусь за гэты ж перыяд часу прыехалі больш за 13 тысяч замежных працоўных мігрантаў, сярод якіх апынулася шмат кітайцаў, украінцаў і расіян.

Пра тое, што адбываецца на беларускім рынку працы, у каментары «Салідарнасці» распавёў старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці Генадзь Фядыніч.

— Што тычыцца кітайскіх рабочых, то тут, па ўсім відаць, размова ідзе пра тыя звязаныя крэдыты, якія КНР выдае Беларусі, — сказаў прафсаюзны лідар. — Там прадугледжаны ўдзел кітайскіх рабочых. Проста так кітайцы сюды на працу не ездзяць. І, дарэчы, беларускія працоўныя ўладкавацца туды на працу не могуць.

Паводле інфармацыі суразмоўцы, кітайскія рабочыя сёння задзейнічаны на праектах у Добрушы, у будаўніцтве дарог, а таксама індустрыяльным парку «Вялікі камень».

— Што ж тычыцца ўкраінцаў, то раней былі некаторыя праблемы па Брэсцкай вобласці, калі яны ўладкоўваліся на працу за значна меншыя грошы, чым хацелі атрымаць беларусы. Але на агульную палітыку працаўладкавання грамадзян гэта моцна не ўплывала, — адзначае ён.

У той жа час, па словах суразмоўцы, значна больш сур'ёзнай выглядае праблема адтоку беларусаў за мяжу:

— Колькі чалавек з'язджае ў Расію — сёння абсалютна не магчыма падлічыць. І афіцыйная статыстыка не кантралюе гэтую сітуацыю. Туды едзе працаўладкоўвацца моладзь, якая жыве ў памежных раёнах. Шмат людзей едуць і ў Польшчу: там таксама несалодка, тым не менш, сваіх 500–600 долараў зарабіць можна. Тут такой працы большасць маладых людзей і ў жыцці не знойдзе!

Генадзь Фядыніч падкрэслівае, што ў апошні час за мяжу едуць не толькі будаўнікі: «У тую ж Расію адпраўляюцца медыкі і настаўнікі, маючы там значна большы заробак, чым у Беларусі».

Па словах эксперта, усё гэта стварае сур'ёзную пагрозу для эканомікі Беларусі:

— Нікому не патрэбныя проста кадры, а патрэбныя спецыялісты. Як правіла, выязджаюць далёка не горшыя — а тыя работнікі, якія маюць адпаведную кваліфікацыю. І ў гэтым ёсць асноўная небяспека. Беларусь можа назаўсёды страціць сваіх людзей, пакуль нам абяцаюць заробак у 500 долараў. Не сакрэт, што цяпер у нашых краях «за шчасце» мецъ 350–400 долараў у буйных гарадах і 250 долараў — у раённых цэнтрах.

**gazetaby.com, пераклад НЧ**

# Служба ў войску як абавязак грамадзяніна

**Закон «Аб альтэрнатыўнай службе», які ўступіў у сілу з ліпеня 2016 года, не апраўдаў чаканняў праваабаронцаў.**




Гібель салдата тэрміновай службы ў вайсковай часці Печы пад Барысавам актуалізавала праблематыку альтэрнатыўнай грамадзянскай службы. Абарона краіны, як і паўсюль, з'яўляецца адным з абавязкаў грамадзян Беларусі, замацаваным у Канстытуцыі.

Аднак у галоўным законе таксама замацаванае права грамадзян на рэалізацыю гэтага абавязку ў іншых формах, не звязаных са службай у войску. Пашырэнне палажэнняў закона аб альтэрнатыўнай грамадзянскай службе і перавод войска цалкам на кантрактную сістэму забяспечаць рэалізацыю гарантаваных Канстытуцыяй правоў на практыцы, мяркуюць праваабаронцы «Вясны».

Як тлумачыць Валянцін Стэфановіч, замацаваны ў Канстытуцыі краіны ваенны абавязак не мае абсалютнага характару і можа рэалізоўвацца ў форме альтэрнатыўнай службы. Аднак Закон «Аб альтэрнатыўнай службе», які ўступіў у сілу з ліпеня 2016 года, не апраўдаў чаканняў праваабаронча супольнасці краіны, паколькі дыскрымінуе асобаў, якія адмаўляюцца ад праходжання вайсковай службы паводле матываў сумлення.

«Па-першае, закон прадугледзеў толькі адну катэгорыю грамадзян, якая можа разлічваць на альтэрнатыўную службу, — паводле рэлігійных перакананняў. А паняцце «перакананні сумлення» — значна шырэйшае. Напрыклад, чалавека, які не з'яўляецца вернікам, аднак ён — прынцыповы пацыфіст і разглядае вайсковую службу як падрыхтоўку да вайны, да забойства сабе падобных, заканадаўства абавязвае служыць у войску, а за ўхіленне ад службы ён трапляе пад крымінальны пераслед. Яго могуць асудзіць нават да пазбаўлення волі», — кажа Валянцін Стэфановіч.

У выпадку зняволення чалавека, які будзе матываваць адмову ад службы ў войску сваімі перакананнямі і будзе паслядоўна адстойваць права на альтэрнатыўную службу, у праваабаронцаў узнікнуць падставы для прызнання яго палітычным зняволеным. Але пакуль у Беларусі такой практыкі не было.

«Другі аспект — тое, што тэрміны альтэрнатыўнай службы, на наш погляд, неабгрунтавана перавышаюць тэрміны службы ў войску. Асабліва, калі мы параўноўваем з такой катэгорыяй, як служба ў рэзерве. Паводле нашага меркавання, гэта дыскрымінацыя. Бо атрымліваецца, што асобы з антымілітарысцкімі перакананнямі павінны аддаваць доўг радзіме значна большы тэрмін, чым тыя, хто такіх перакананняў не мае. Тым больш на гэтую тэму ёсць рашэнне Камітэта па правах чалавека ААН», — працягвае праваабаронца.

Валянцін Стэфановіч меў на ўвазе рашэнне ў справе «Фуэн супраць Францыі (№666/1995)», дзе КПЧ ААН прызнаў, што ўдвая большы тэрмін альтэрнатыўнай службы ў параўнанні з вайсковай службай з'яўляецца дыскрымінацыяй па прыкметах перакананняў і парушэннем дзяржавай-удзельніцай артыкула 26 Міжнароднага Пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, ратыфікаванага і беларускай дзяржавай.

Таксама Стэфановіч мяркуе, што прызыўная сістэма фармавання войска павінна быць скасаваная, войска павінна стаць цалкам кантрактным, прафесійным — тады яно зможа якасна выконваць сваё прызначэнне, і прынамсі такія праблемы, як дзедаўшчына, там фактычна будуць адсутнічаць.

Аднак гэта патрабуе якасна іншага падыходу дзяржавы — рэфармавання войска, яго скарачэння і аптымізацыі.

Ці могуць улады Беларусі пайсці на такое — вялікае пытанне. І гэта пытанне ўжо выключна палітыкі дзяржавы.

**Паводле spring96.org**

# Штрафы за гісторыю

Зінаіда ЦІМОШАК

**Вучыць дзяцей гісторыі, якая не трапляе ў афіцыйныя падручнікі, — падсудная справа. У гэтым пераканаліся некалькі вядомых грамадскіх актывістаў.**

Нагадаем, мастак Алесь Пушкін 1 верасня ў Слуцку арганізаваў для сына ўрок гісторыі, прысвечаны Слуцкаму паўстанню. Замест традыцыйнай школьнай лінейкі ў Бабры васьмікласнік Мікола Пушкін прыняў удзел у адмысловым уроку гісторыі ў Слуцку пад назвай «Дзень ведаў — урок гісторыі».

Грамадская актывістка і ініцыятарка кампаніі па ўсталяванні помніка слуцкім паўстанцам Аліна Нагорная выканала ролю настаўніцы гісторыі. Аліна правяла вучня і іншых удзельнікаў «урока» па гістарычных месцах Слуцка і распавяла пра найбольш значныя падзеі мінуўшчыны. У своеасаблівай імпрэзе ўдзельнічаў і Алесь Лагвінец з сынам Антосем.

Гэта не задаволіла беларускія ўлады. 15-хвілінная вандроўка з сябрамі па горадзе, прычым без лозунгаў і транспарантаў, была расцэненая як масавае мерапрыемства і несанкцыянаванае шэсце. 16 кастрычніка ў судзе Слуцкага раёна суддзя Аляксандр Тарасюк прызнаў Аліну Нагорную вінаватай у здзяйсненні адміністратыўнага правапарушэння па часткы 2 артыкула 23.34 (парушэнне вызначанага парадку арганізацыі альбо правядзення сходу, мітынгу, вулічнага шэсця). Інтэрактыўны ўрок гісторыі па тэме Слуцкага паўстання для двух маладых людзей і двух іх бацькоў быў расцэнены міліцыяй і суддзёй як масавае шэсце без дазволу ўладаў.

Дарэмна арганізатарка ўроку і яе адвакат Вадзім Мушынскі звярталі ўвагу суддзі на адсутнасць вялікай колькасці людзей і публічных лозунгаў падчас аповеду пра Юрку Лістапада і Паўла Жаўрыда — суддзя аштрафаваў аматарку таямніц слуцкай гісторыі на 20 базавых велічынь.

Гісторыя працягнулася ў Мінску. Суддзя Маскоўскага раёна Таццяна Матыль пацвердзіла меркаванне свайго калегі са Слуцку і пакарала за гэты ўрок гісторыі Алеся Лагвінца. Праменад па Слуцку з экскурсіяй на фабрыку слуцкіх паясоў абышоўся Лагвінцу ў 50 базавых велічыняў — 1150 беларускіх рублёў. Палітык пакараны па 3 часткы артыкула 23.34 — парушэнне парадку арганізацыі альбо правядзення масавых мерапрыемстваў без дазволу ўлады паўторна на працягу 1 года. Раней ён ужо быў асуджаны па гэтым артыкуле 23 сакавіка. Тады яму прысудзілі арышт на 15 сутак.

Але найбольшыя непрыемнасці яшчэ чакаюць ініцыятара імпрэзы, мастака Алеся Пушкіна. На яго складзеныя адразу тры адміністратыўныя пратаколы: першы — па ч.1 арт. 23.34 КаАП, другі — па ч. 2 арт. 21.14 (парушэнне правіл утрымання населеных пунктаў), а трэці — па ч.1 арт. 9.4 КаАП (невыкананне бацькамі або асобамі, якія іх замяняюць, абавязкаў па выхаванні дзяцей, што пацягнула здзяйсненне непаўналетнім дзеі, якая змяшчае прыкметы адміністрацыйнага правапарушэння або злачынства).

Правілы ўтрымання населеных пунктаў Пушкін парушыў, бо прымацаваў на часовым плоце, якім абкружана месца рамонту Слуцкага краязнаўчага музея, тры партрэты ўдзельнікаў Слуцкага збройнага чыну. А яго сын Мікалай таксама ажыццявіў «злачынства» — прысутнічаў на недазволеным «шэсці» ў Слуцку, а не на школьнай лінейцы.

Алесь Пушкін напісаў тлумачэнне да пратаколаў, якія датычацца «слуцкай гісторыі». У тлумачэнні ён не лічыць сябе ў чымсьці вінаватым, «бо гэта быў яго свядомы ўчынак як бацькі, каб выхаваць сына патрыётам і каб ён практычна даведаўся пра гісторыю Случчыны». Мастак паабяцаў, што так яны з сынам будуць рабіць і надалей: кожны год 1 верасня будуць выязджаць у іншыя рэгіёны Беларусі, знакамітыя сваёй гістарычнай спадчынай, і праводзіць там Дзень ведаў.

А Аліна Нагорная збіраецца абскардзіць прысуд. «Лічу, што я абавязаная і надалей змагацца за права людзей свабодна хадзіць Слуцку — нават з гербам гэтага горада і партрэтамі яго лепшых людзей, — заявіла актывістка. — Фактычна, мяне пакаралі за спробу выканаць Канстытуцыю і зберагчы нацыянальную каштоўнасць. Гісторыя Слуцкага збройнага чыну і ёсць такая каштоўнасць, ад якой так грэбліва адмахваюцца мясцовыя ўлады, міліцыянты і суд».

Дарэчы, на мерапрыемстве 1 верасня ў Слуцку прысутнічаў і назіральнік ад праваабаронцаў. Праваабаронцамі яшчэ да суда быў зроблены адмысловы маніторынг аб адсутнасці правапарушэнняў пры правядзенні ўроку.

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# Рост ВУП як дэпрэсія

Сяргей САЛАЎЁЎ

**«Ды ўсё ў нас добра», — сцвярджае афіцыйная статыстыка. Але, гледзячы на аптымістычныя лічбы, чамусьці згадваецца знакамітая песня Лявона Вольскага: «Лепей не будзе, будзе толькі горш». Можа, гэта восеньская хандра?**

Не паддаецца гэтай традыцыйнай хваробе наш Белстат. Чарговыя аптымістычныя лічбы былі выдадзеныя на тыдні. ВУП Беларусі ў студзені-верасні падрос на 1,7% у параўнанні з аналагічным перыядам 2016 года. Дэфлятар ВУП (цэнавы індэкс) за 9 месяцаў склаў 108,5%.

За той жа перыяд аб'ём прамысловай вытворчасці ў бягучых цэнах склаў 106,1%. У горназдабываючай прамысловасці рост склаў 3,2%, у апрацоўчай прамысловасці — 6,6%, у забеспячэнні электраэнергіяй, газам, парай, гарачай вадой і кандыцыянаваным паветрам — 5,4%. І ўвогуле, у 11 з 13 галін апрацоўчай прамысловасці аб'ём вытворчасці за студзень-верасень 2017 года перасягнуў узровень аналагічнага перыяду 2016 года.

У сельскай гаспадарцы — таксама рост, супастаўны з ростам ВУП, то бок на 1,7%. А ў супастаўных цэнах на — 2,3% больш, чым у адпаведным перыядзе папярэдняга года.

У сельскагаспадарчых арганізацыях рэспублікі практычна завершана ўборка збожжавых і зернебабовых культур (без кукурузы). На 1 кастрычніка збожжа намалочана 7,7 мільёна тон, або на 9,1% больш, чым на аналагічную дату 2016 года. Сярэдняя ўраджайнасць склала 35,6 цэнтнера з гектара супраць 33,2 цэнтнера ў 2016 годзе.

На пачатак кастрычніка бягучага года бульбу прыбралі з 67% плошчаў. Накапана бульбы 634,6 тысячы тон, ураджайнасць атрыманая 310 цэнтнераў з аднаго гектара супраць 262 цэнтнераў у папярэднім годзе. Буракі цукровыя прыбраныя з 34,2% плошчаў, гароднiна — з 61,5% плошчаў. Вытворчасць апошняй павялічылася аж на 3%!

I гэта яшчэ не канец, таму што, як мы бачым па лічбах, уборка яшчэ далёка не скончаная — нягледзячы на тое, што шмат дзе прайшлі раённыя «Дажынкі». Самы час парадавацца за поспехі роднай народнай гаспадаркі і адказаць усім тым, хто тры-чатыры месяцы таму енчыў наконт «кепскага лета» і снегу ў маі. Нармальнае было лета, глядзіце, якая бульба паперла! Трэба было не на Мальдзівах і ў Турцыях адпачываць, а ў бабулі на градах!

А хто не паспеў улетку пакапацца ў гэтых градах, той яшчэ мае шанец усё выправіць. На пасяджэнні прэзідыума Саўміну 17 кастрычніка прэм'ер Андрэй Кабякоў даручыў поўнасцю завяршыць уборку ўраджаю з палёў да 31 кастрычніка. Неабходна прыбраць дзве траціны ўборачных плошчаў кукурузы на зерне, траціну кукурузы на сілас, 40% плошчаў цукровых буракоў, на палях засталося 13% бульбы і 14% льнотрасты. Так што ёсць дзе працаваць і куды імкнуцца!

Галоўнае пытанне — што мы потым з усім гэтым будзем рабіць. Самі мы столькі не з'ядзім, а прадаваць хутка будзе няма каму.

Праўда, наш асноўны гандлёвы партнёр вуснамі свайго прэм'ера Мядзведзева заявіў, што Расія поўнасцю прыстасавалася да заходніх санкцыяў. Але, тым не менш, паводле дадзеных расійскіх статыстыкаў, аднаўленне паказчыкаў расійскай прамысловасці, якое Расстат фіксаваў у першай палове года, пайшло на спад. У трэцім квартале тэмпы росту вытворчасці замарудзіліся больш чым удвая. Фабрыкі і заводы ў сегменце апрацоўкі вярнуліся ў «мёртвую зону» стагнацыі і калянулявых паказчыкаў на мяжы хібнасці вымярэнняў.

**Паводле прагнозу Міжнароднага валютнага фонду, нафта ў 2040 годзе будзе каштаваць 15 доляраў за барэль. А калі Расія страціць галоўную крыніцу свайго даходу, хто будзе набываць нашы харчы? І яшчэ адно пытанне: хто будзе іх прадаваць?**

А калі ў Расіі стагнацыя — дык і грошай, каб набываць нашу прадукцыю, у іх паменее.

Калі будуць увогуле. Таму што асноўны даход Расіі — сыравіна, а канкрэтна — нафта. Між тым, аналітыкі «Bank of America» кажуць, што да заканчэння нафтавай эры засталося 5 гадоў.

На іх думку, бензінавы транспарт, на які прыпадае 57% сусветнага спажывання «чорнага золата», пачне саступаць месца электрамабілям, экспанента вытворчасці якіх прыпадзе на пачатак наступнага дзесяцігоддзя — у 2022–2023 гадах у Еўропе і ў 2024-м — у Кітаі і ЗША. А да 2050 года электракары зоймуць 90% рынку.

Пры гэтым машын толькі з рухавікамі ўнутранага згарання не застанецца зусім. Астатнія 10% рынка будуць займаць гібрыды, якія спалучаюць як бензін, так і электрацягу.

Ключом да развіцця электратранспарту стане зніжэнне кошту акумулятарных батарэй, павелічэнне іх ёмістасці — і, як следства, павелічэнне далёкасці прабегу без падзарадкі. Адначасова ўпадзе цана сілавой устаноўкі. Рынку дапамогуць дзяржсубсідыі і ўрадавыя праграмы, да якіх далучыліся не толькі большасць еўрапейскіх краін, але і Кітай. Апошні паставіў мэту: 50% электрамабіляў да 2030 года.

У Парыжы аўтамабілі з рухавікамі ўнутранага згарання плануюць забараніць з 2030 года, забарона на дызельныя машыны прыйдзе яшчэ раней — з 2024 года, калі сталіца Францыі прыме Алімпійскія гульні. У Вялікабрытаніі поўную забарону на бензінавыя аўто ўвядуць з 2040 года.

З такім прагназам згодны і кіраўнік Ашчадбанка Расіі Герман Грэф. Ён зазначыў, што ў выніку нафта паўторыць лёс вугалю і драўніны. Паводле прагнозу МВФ, нафта ў 2040 годзе будзе каштаваць 15 доляраў за барэль. «Гэта не тое, што можа задаволіць нашу краіну. 20–25 гадоў да гэтай перспектывы — вельмі маленькі тэрмін», — сказаў Грэф.

А калі Расія страціць галоўную крыніцу свайго даходу, хто будзе набываць нашы харчы? І яшчэ адно пытанне: хто будзе іх прадаваць?

На тыдні мы пабачылі доўгачаканы ўказ кіраўніка дзяржавы пра скарачэнне праверак у бізнесе. І што? Згодна з ім, колькасць кантралёраў павінна быць скарочаная на траціну, а колькасць кантраляваных сфер, — удвая.

Але «Еўрарадыё» знайшло ў новым указе цэлых дзевяць падстаў, якія дазваляць кантралёрам прыйсці на прадпрыемства з пазапланавай праверкай.

Пералічваць усе не будзем. Задаволімся адным, і вельмі кароткім: пазапланавая праверка можа праводзіцца «па прычыне невыканання правяраючым (кіраўніком праверкі) устаноўленага парадку правядзення праверак».

То бок, кшталту: «Выбачайце, мы насамрэч накасячылі. Каб выправіць нашы касякі, вас трэба яшчэ раз праверыць. І яшчэ. І яшчэ»... Ну і так да бясконцасці.

Правяраючых, можа, і стане менш. Але гэта азначае, што яны будуць трымацца за свае месца і паказваць бачнасць бурнай дзейнасці і сваю патрэбнасць. А значыць, праверак стане не менш, а больш.

Так што лічбы — гэта яшчэ не ўсё. За імі стаіць не вельмі вясёлкавая перспектыва.

ФІГУРЫ ТЫДНЯ



## Вячаслаў Сіўчык

**Вядомага грамадскага дзеяча тэрмінова «перасудзілі». Прычым, па яго словах, з такім правасуддзем ён сутыкаецца ўпершыню.**

Справа ў тым, што 28 верасня Сіўчыку прысудзілі 45 базавых велічынь штрафу за ўдзел у акцыі 8 верасня ў Мінску. 5 кастрычніка Сіўчык атрымаў матываваную частку рашэння суда Партызанскага раёна, і па законе да 15 кастрычніка меў час на абскарджванне штрафу ў Мінгарсудзе. Аднак высветлілася, што той штраф абскардзіў... пракурор. Па меркаванні пракуратуры, пакаранне Сіўчыка штрафам — занадта мяккі прысуд.

Сіўчык намагаўся абскардзіць такую выснову пракурора, але фактычна гэта яму зрабіць не далі: 9 кастрычніка ён атрымаў пракурорскі ліст, а 11 кастрычніка Мінскі гарадскі суд ужо адмяніў яму штраф і прызначыў новы разгляд яго справы ў судзе Партызанскага раёна. Суд Партызанскага раёна не менш тэрмінова — 16 кастрычніка, — даў грамадскаму актывісту 5 сутак арышту завочна.

«Лічу, што гэта незаконнае рашэнне, бо былі парушаныя тэрміны абскарджвання пастановы Партызанскага суда. Я сам спрабаваў абскардзіць тую пастанову, але маю заяву не разгледзелі, а скаргу пракуратуры сабраліся разглядаць ужо праз два дні, як яна была пададзеная. Такой спешкі ніколі не было», — кажа Вячаслаў Сіўчык.

Паводле яго меркавання, такая дзейнасць судовай сістэмы звязаная з плануемай у Мінску чарговай акцыяй пратэсту ўвечары 21 кастрычніка.



## Ганна Канапацкая

**Дэпутатка Палаты прадстаўнікоў і сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі больш не стварае грамадзянскую кампанію «Наперад, Беларусь!».**

Гэтым зоймецца яе памочнік і дарадца Дзяніс Ціханенка.

«Ініцыюючы грамадзянскую кампанію «Наперад, Беларусь!», я выхodзіла з неабходнасці знайсці формы супрацоўніцтва з людзьмі, якія хочуць пазітыўных змен у краіне, але з тых ці іншых прычын не гатовыя адкрыта заяўляць аб падтрымцы апазіцыі. Зварот быў раскрытыкаваны на пасяджэнні Палітрады АГП. Сапраўды, некаторыя фармулёўкі маёй заявы былі не зусім карэктныя, што выклікала шмат пытанняў», — напісала дэпутатка ў Facebook.

Зразумела, Палітрада АГП была прадказальна здзіўленая ініцыятывай Канапацкай, бо стварэнне ёю новага руху парушае Статут партыі. Таму Палітрада запатрабавала ад яе дэзавуяваць дакумент аб стварэнні грамадзянскай кампаніі і паведаміць пра сваё рашэнне не пазней за 16 кастрычніка.

Таму дэпутатка «адхрысцілася» ад новага руху. А Дзяніс Ціханенка выйшаў з АГП. Цікава, ці задаволіць такое рашэнне партыю?



## Віталь Шчэрба

**Славуты беларускі гімнаст, які цяпер пражывае ў ЗША, трапіў у секс-скандал.**

Украінская гімнастка, двухразовая алімпійская чэмпіёнка, неаднаразовая чэмпіёнка свету Таццяна Гуцу абвінаваціла беларускую легенду спорту Віталя Шчэрбу ў згвалтаванні. Гэтую скандальную заяву Гуцу зрабіла на сваёй старонцы ў Facebook 17 кастрычніка, пачаўшы словамі: «Я стала смелай праз 27 гадоў».

Паводле слоў Гуцу, Шчэрба згвалціў яе падчас спаборніцтваў у нямецкім Штутгарце ў 1991 годзе, калі гімнастцы было 15 гадоў. Шчэрба нарадзіўся ў студзені 1972-га — яму тады было 19 гадоў.

«Віталь Шчэрба — монстр, які трымаў мяне ў маёй уласнай турме страхаў шмат гадоў. Я ведаю, ты паспрабуеш абараніць сябе. Але мае дэталі значна мацней тваіх слоў. Я зараз моцная, як ніколі», — напісала Гуцу.

Таксама Гуцу «дзякуе» партнёрам па камандзе, якія не заступіліся за яе. «Дзякуй табе, Таццяна Торапава, цябе я лічыла сваёй сяброўкай, а ты не заступілася за мяне, калі мне гэта трэба было больш за ўсё. Рустам Шарыпаў, дзякуй табе, што не абараніў мяне — маленькую 15-гадовую дзяўчынку», — піша Гуцу.

Іронія ў тым, што Гуцу, як і Шчэрба, таксама жыве ў ЗША і таксама мае сваю гімнастычную школу.




# Юры Хашчавацкі: «Я мог стаць мільянерам»

Алег НОВІКАЎ

**Вядомы рэжысёр, гуру беларускай дакументалістыкі Юры Хашчавацкі 18 кастрычніка адзначыў сваё 70-годдзе. Напярэдадні ён расказаў чытачам НЧ, пра што зняў свой першы фільм, як прыехаў з Адэсы ў Мінск, пра тое, які фільм здымае зараз. А яшчэ пра памылку, якую здзейсніў з Лукашэнкам...**



***— Ці з'яўляецца для вас сямідзесяцігоддзе жыццёвай памежнай датай?***

— Ну, я не думаю, што гэта нейкі рубеж. Але ў любым выпадку, хочаш — не хочаш, а даводзіцца падвесці вынікі. Тут ужо няма куды падзецца.

***— Ці была, а можа да гэтага часу ёсць, у вас нейкая формула самарэалізацыі?***

— На пэўным этапе я вельмі хацеў здымаць кіно. Я ішоў да гэтага. Доўга ўгаворваў рэдактара, каб мне далі здымаць кіно. Нарэшце ў 1983-м я зняў свой першы фільм. Пасля гэтага пайшла мая кінакар'ера. Вядома, былі жаданні выйграваць фестывалі. Але паступова ўсё гэта — прызы, апладысменты — стала наносным, менш значным. Па жыцці з'яўляецца новая ўстаноўка: рабі кіно, і рабі яго годна. А потым хай будзе, што будзе. Як, напрыклад, здарылася з фільмам «Звычайны прэзідэнт». Гэты фільм будзе працаваць, таму што ён — наша гісторыя, якая стане этапам нашай біяграфіі.

***— Згодна біяграфіі, пачыналі вы не як лірык, а, хутчэй, як фізік. Ваша альма-матэр — Адэскі тэхналагічны інстытут...***

— Як і ўсе савецкія дзеці, мы рабілі жыццё з кагосьці. На мяне вельмі паўплываў фільм «Дзевяць дзён аднаго года» пра сакрэтных фізікаў. Лозунг асваення прыроды, смеласці быў адным з дэвізаў пакалення 1960-х, якое фармавалася таксама на фоне палітычнай адлігі. Памятаю, дачка маёй класнай пазнаёміла мяне з Акуджавам. Мама неяк прынесла «Раман-газету» з апавяданнем Салжаніцына. З прачытанага, праўда, мне запомнілася толькі фраза «а на фуя мне гэта трэба», якую кажа адзін з герояў.

Я пачаў цікавіцца палітыкай зусім выпадкова, пасля таго, як паставіў у інстытуце тэатральны вечар, дзе чыталі вершы Ашкеназі. Я нават не ведаў, што ён быў дысідэнтам, уцекачом у ФРГ. Паколькі ўсё адбывалася пасля Пражскіх падзеяў 1968-га, для дэманстрацыі палітычнай пільнасці мяне выключылі з ВНУ.

Наступным этапам быў рух КВЗ, куды я трапіў праз студэнцкую самадзейнасць. Там было вельмі шмат нестандартных і самых вядомых пазней людзей, напрыклад, Барыс Бурда або Барыс Херсонскі. Праўда, да пачатку 1970-х гадоў КВЗ пачаў выраджацца, сыходзіць у камерцыю. Перад кожным паўстала пытанне: у халтуршчыкі або ў прафесіяналы. Я абраў другое. І калі завочна скончыў інстытут ды трапіў у Мінск, ужо ведаў, што хачу стаць тэатральным рэжысёрам. Праўда, у выніку стаў дакументалістам.

***— Ці не было для вас шокам пасля курортнай, партовай Адэсы апынуцца ў досыць спакойным Мінску?***

— Былі, хутчэй, складанасці. Адэса — вельмі эмацыйная і гучная. І таму я ўспрымаўся як вельмі агрэсіўны чалавек. Ледзь не штодня даводзілася біцца. Былі праблемы з міліцыяй. Але неўзабаве я стаў сваім.

> **Першыя пару месяцаў пасля абрання Лукашэнкі ў мяне былі ідэі наконт рэфармавання БТ. Мы прапанавалі праект, які ў выніку згарнулі. А ўсё стала зразумела пасля выхаду фільма «Нянавісць. Дзеці хлусні»**

***— Як вам удалося атрымаць права зняць свой першы фільм?***

— У 1983-м на тэлефільме ляжаў сцэнар, ад якога адмовіліся ўсе рэжысёры. Гэта быў нестандартна напісаны тэкст. І тады галоўны рэдактар узгадаў, што за ім даўно ходзіць адзін хлопец. Ён прапанаваў мне здымкі, а я сказаў «так». І толькі потым прачытаў сцэнар. На самай справе, я здымаў не па сцэнары, але ўсё роўна тэкст даў штуршок. Першая фраза была такая: «З кабінета райпатрэбкаапераццыі можна ўбачыць кніжную краму. А калі глядзець з кнігарні, можна ўбачыць кабінет. Вось так нашы матэрыяльныя патрэбы адпавядаюць духоўным, і наадварот». І было зразумела, як рабіць фільм — ён павінен быць іранічным. І, дзякуючы такому падыходу, выйграў гран-пры на ўсесаюзным фестывалі.

***— Калі вы ўпершыню пачулі пра Лукашэнку?***

— З Лукашэнкам я здзейсніў тую памылку, якую здзейсніла ўся Беларусь, якая думае. Я запомніў яго голас, які чуў па радыё і тэлебачанні. Тады разумеў задуму «маладых ваўкоў», якія вырашылі выкарыстаць Лукашэнку ў якасці тарану супраць непапулярнага рэжыму Кебіча. Першыя пару месяцаў пасля абрання Лукашэнкі ў мяне былі ідэі наконт рэфармавання БТ. Мы прапанавалі праект, які ў выніку згарнулі.

Усё стала зразумела пасля выхаду фільма «Нянавісць. Дзеці хлусні». Калі я ўбачыў, у штоператвараецца дакументальнае кіно, я вырашыў зрабіць сваё кіно. Сёння я магу прызнацца, што прадзюсар Пётр Марцаў, які фінансаваў «Звычайнага прэзідэнта», атрымліваў грошы ад бізнесмена Пупейкі.




Фота www.tfile.cc

Цікава, што пазней Пупейка эміграваў у Польшчу, а Мінск запатрабаваў яго экстрадыцыі. У выніку палякі адмовіліся выдаваць Пупейку — якраз пасля дэманстрацыі на польскім тэлебачанні «Звычайнага прэзідэнта». На жаль, такіх, як Пупейка, было мала. У большасці ўсе хацелі хапануць.

Я таксама мог стаць мільянерам. Летам 1991-га мне патэлефанавалі з ЦК камсамола і прапанавалі зняць кіно. Я прыйшоў з напрацоўкамі і прапанаваў некалькі варыянтаў. А потым гляджу: ім нецікава. Камсамольцы кажуць: «Давайце мы дадзім вам тры мільёны, а вы здымеце матэрыялы і не будзеце выказваць прэтэнзій». Я спачатку не зразумеў, у чым гульня. Потым уцяміў: яны бяруць мае матэрыялы і пад іх пішуць заяўку на фільм з бюджэтам, скажам, 30 мільёнаў. Калі б усё атрымалася, па тым курсе рубля я б атрымаў каля мільёна долараў. Але, паколькі была пятніца, падпісанне дамовы перанеслі на панядзелак. А ў панядзелак было 19 жніўня, пачаўся путч. І ўсім было ўжо не да кіно.

***— Знаходзячыся па-за сістэмай, вы працягваеце здымаць папулярныя фільмы, і да таго ж працуеце на «Белсаце». Можа, нашаму кіно не патрэбныя ніякія перамены?***

— Не, гэта ўсё роўна ненармальна. Як можна здымаць у такіх умовах? Адзін мой знаёмы маскоўскі аператар здымаў мяне на вуліцы пяць гадоў таму і трапіў у аб'ектывы вулічных камер. У выніку яго выкраслілі з прэзідэнцкага пулу, то бок практычна пазбавілі акрэдытацыі. Але, безумоўна, мы прыдумалі новы фармат працы. Мы працуем без офісаў, па скайпу... Акрамя таго, з'явіўся відэахостынг — асноўны пастаўшчык відэаматэрыялу. За працай з інтэрнэт-матэрыяламі будучыня нашай дакументалістыкі.

***— Ужо вядомым дакументалістам, вы ўдзельнічаеце ў палітыцы, з'яўляецеся чальцом Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП). Навошта вам палітычны актывізм, калі кожны ваш фільм мае большы грамадскі рэзананс, чым, напрыклад, удзел у выбарах?***

— Я паважаю АГП як каманду адукаваных людзей, якая не захапляецца папулізмам. АГП не хлусіць, і мне гэта падабаецца. Калісьці ў 2000 годзе яны папрасілі мяне арганізаваць кампанію «байкоту», і для гэтага мне давялося запісацца ў партыю. А выходзіць адтуль я не буду, бо я ім дапамагаю. Гэта па-першае. А па-другое, калі я выйду (можа, гэта было б і лагічна для рэжысёра), гэтым тут жа скарыстаюцца іх апаненты. Я паважаю АГП і не хачу адтуль сыходзіць.

***— Што збіраецеся паспець да 75-годдзя?***

— Галоўнае — дажыць, і дажыць годна. Цяпер я заканчваю фільм «Гэты шалёны, шалёны, шалёны рускі свет», у якім на прыкладзе грузіна-расійскіх адносінаў хачу расказаць пра асаблівасці імперскай прапаганды. У мяне ёсць яшчэ нейкія даўнія задумы наконт кіно, але гэта, хутчэй, мара. Значна больш рэальна скончыць да наступнага юбілею кнігу пра дакументальнае кіно, якая будзе сумяшчацца з мемуарамі.

# Балонскі працэс: «Мы рухаемся»

Дзіяна СЕРАДЗЮК

**З далучэннем да Балонскага працэсу ў 2015 годзе Беларусь атрымала Дарожную карту рэформ вышэйшай адукацыі, дзе пералічаны ўмовы, якія краіна ўзялася выканаць. У маі 2018 года Advisor Group on Support for the Belarus Roadmap (AG2) дасць справаздачу аб праведзенай працы на саміце міністраў адукацыі ў Парыжы.**

Што было зроблена ў галіне рэфармавання вышэйшай адукацыі Беларусі за 2,5 года, мы паспрабавалі даведацца ў сябра AG2, прарэктара па навукова-метадычнай працы Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы (РІВШ) Ігара Цітовіча.



Паводле яго словаў, Балонскі працэс — гэта, у першаю чаргу, пляцоўка, дзе можна паразмаўляць з прафесіяналамі і выкарыстаць досвед іншых краін, каб не паўтараць іх памылкі. Увесь ход рэформ ён апісвае досыць лаканічна: «Мы рухаемся».

Каб зразумець, якім чынам гэта адбываецца, звернемся да некаторых канкрэтных пунктаў Дарожнай карты.

## Нацыянальная рамка кваліфікацый (НРК)

Гэта сукупнасць механізмаў прававога і інстытуцыйнага рэгулявання кваліфікацый работнікаў з улікам патрэб рынку працы і магчымасцяў сістэмы адукацыі.

— У 2014 годзе была спроба фармавання Нацыянальнай сістэмы кваліфікацый, часткай якой з'яўляецца Нацыянальная рамка кваліфікацый. Яна была эксперыментальнай у дзвюх галінах — кіравання і інфармацыйных тэхналогій, — распавядае Ігар Цітовіч.

Ужо па далучэнні Беларусі да ЕПВА ўзнікла неабходнасць распрацаваць НРК вышэйшай адукацыі, якая б суадносілася з Усеахопнай рамкай кваліфікацый Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі (EQF-EHEA). Гэта дазволіць суаднесці узровень падрыхтоўкі беларускіх студэнтаў з выпускнікамі іншых універсітэтаў. План распрацоўкі НРК Міністэрства адукацыі падпісала сёлета ў лютым (а да гэтага ў студзені ў Берліне на пасяджэнні AG2 былі прадэманстраваны яе праект). Ён цяпер дапрацоўваецца і будзе прадстаўлены на чарговым пасяджэнні AG2 ужо ў гэтым месяцы ў Рыме.

## Сістэма заліковых адзінак (крэдытаў)

Сістэма крэдытаў дэ-юрэ ўжо ўведзеная ў практыку і суадносіцца з Еўрапейскай сістэмай пераносу і назапашвання крэдытаў. Праўда, пакуль яна яшчэ не працуе напоўніцу. У перспектыве заліковыя адзінкі таксама будуць больш шырока выкарыстоўваць пры пераводзе і аднаўленні студэнта ў іншую ўстанову адукацыі, на іншую спецыяльнасць або форму навучання, пры арганізацыі акадэмічнай мабільнасці.

Выпускнікі, якія заканчваюць ВНУ пасля 2015 года, у сваіх залікоўках, дыпломах і ўсёй астатняй дакументацыі, акрамя інфармацыі пра нагрузку, што вылічваецца ў акадэмічных гадзінах, ужо атрымліваюць яе і ў сістэме заліковых адзінак.

## Дадатак да дыплома

Замест выпіскі з залікова-экзаменацыйнай ведамасці выпускнікам плануецца выдаваць дадатак да дыплома, які паводле структуры і зместу будзе адпавядаць Агульнаеўрапейскаму дадатку да дыплома.

— Сёння заканадаўства Беларусі не абмяжоўвае ўніверсітэты выдаваць гэты еўрапейскі дадатак да дыплома. Але паколькі ў заканадаўстве на гэты конт увогуле нічога не прапісана, то дзяржава не нясе адказнасць за гэты дакумент па-за сваімі межамі, — тлумачыць Ігар Цітовіч.

Аднак некаторыя ўніверсітэты ўжо выдаюць такі дадатак. Напрыклад, Полацкі дзяржаўны універсітэт робіць гэта па сумеснай з Партугаліяй магістарскай праграме. Адпаведна, адказнасць за дакумент нясуць непасрэдна ПДУ і яго партнёр у Партугаліі.

— У новым праекце Кодэкса аб адукацыі мы прапісалі адказнасць дзяржавы. Прычым упершыню ў беларускім заканадаўстве прапісаны англійскі эквівалент назвы дадатку да дакумента аб вышэйшай адукацыі. Сам ён будзе на трох мовах — беларускай, рускай і англійскай.

Па словах Ігара Цітовіча, ужо распрацаваны дызайн дадатку, аднак яго абавязковае ўвядзенне для ўсіх выпускнікоў адбудзецца толькі пасля таго, як уступіць у сілу новы Кодэкс аб адукацыі. Але калі гэта будзе — невядома, бо парламентары пакуль не разглядалі праект кодэкса.

## Акадэмічная мабільнасць

— У дзяржаўнай праграме «Адукацыя і моладзевая палітыка» на 2016–2020 гады устаноўлена бюджэтнае фінансаванне на праходжанне замежнай стажыроўкі 200 прафесараў штогод. У некаторых падпраграмах вылучаны дзяржаўныя грошы на акадэмічную мабільнасць магістрантаў і навучэнцаў па асобных спецыяльнасцях, напрыклад, ядзернай і атамнай энергетыцы, па якіх у Беларусі няма баз для практыкі, — распавядае прарэктар РІВШ.



Многія беларускія ВНУ маюць дамоўленасці з замежнымі ўніверсітэтамі адносна акадэмічнай мабільнасці. Апроч таго ў 2016–2017 гадах была распрацавана канцэпцыя развіцця акадэмічнай мабільнасці, яна размешчаная на сайце Белдзяржуніверсітэта для грамадскага абмеркавання.

## У рэктары па конкурсе

У Беларусі рэктары большасці ўніверсітэтаў прызначаюцца міністрам адукацыі і ўзгадняюцца кіраўніком Беларусі.

— У шэрагу краін рэктар не з'яўляецца асноўным кіраўніком універсітэта. Ім з'яўляецца структура ці асоба, якая фінансуе ўніверсітэт. Наступная ступень кіравання — рэктар, які з'яўляецца менеджэрам. У нас структура іншая: функцыі кіраўніка і менеджэра спалучаюцца ў асобе рэктара, — тлумачыць Цітовіч.

У той жа час распрацоўшчыкі новай версіі Кодэкса аб адукацыі прапісалі, што вылучэнне кандыдатаў для прызначэння на пасаду кіраўніка ВНУ ажыццяўляецца на конкурснай аснове. Крытэры конкурснага адбору кандыдатаў для прызначэння на пасаду рэктара будуць распрацаваныя пазней.

## Размеркаванне застанецца

Адна з балючых тэмаў беларускай вышэйшай адукацыі — размеркаванне.

— З савецкіх часоў гістарычна склалася, што наша сістэма адукацыі — прафесійна арыентаваная. Сыходзячы з гэтага дзяржава выступае заказчыкам прафесійных кадраў для розных галін. І ў гэтым выпадку яна павінна гарантаваць чалавеку працоўнае месца.

Аднак цяпер рынак працы не можа забяспечыць працоўнымі месцамі ўсіх выпускнікоў. Да таго ж працадаўцы нярэдка наракаюць на падрыхтоўку маладых спецыялістаў.

— Калі я скончыў універсітэт і прыйшоў працаваць у школу, мне таксама сказалі: «Забудзьце ўсё, чаму вас навучылі», — узгадвае Ігар Цітовіч. — Але насамрэч мяне някепска навучылі. Мяне навучылі добра, але я прыйшоў туды, дзе быў не патрэбны высокі ўзровень. Працадаўцаў прыцягваюць да распрацоўкі адукацыйных стандартаў. І іх пярэчанні адносна таго, што прыходзяць не тыя спецыялісты, якія патрэбныя, вынікаюць не з праблемы сістэмы адукацыі, а з таго, што працадаўцы павінны спрагназаваць, які спецыяліст ім будзе патрэбны праз чатыры-пяць гадоў. Другі шлях: група працадаўцаў аднаго профілю можа стварыць прафесійны стандарт. Гэта дакумент, у якім прапісаныя кампетэнцыі, неабходныя спецыялісту на канкрэтнай вытворчасці. На аснове гэтага прафесійнага стандарту сістэма адукацыі распрацоўвае свае адукацыйныя стандарты. Праблема гэтага шляху ў тым, што распрацоўка прафстандартаў — дарагая, і не ўсе працадаўцы хочуць гэта рабіць.

Што да праблемы недахопу працоўных месцаў для выпускнікоў — яе можа вырашыць сістэма прагназавання колькасці кадраў, неабходных для той ці іншай галіны.

## Дзе шукаць інфармацыю

Сайт Міністэрства інфармацыі на запыт пра Балонскі працэс перанакіроўвае на старонку РІВШ, дзе размешчаны асноўныя дакументы і камюніке. Беларускамоўная ж версія сайта Мінадукацыі ўвогуле выдае пустую старонку.

— Асобны сайт па рэалізацыі ў Беларусі элементаў Балонскага працэсу мы робім. Купілі месца, імя, абалонку, але да запуску рукі пакуль не даходзяць, бо трэба распрацоўваць шмат іншых дакументаў. Таму мы крыху не паспяваем. Але сайт, магчыма, будзе запушчаны ўжо са студзеня, — запэўнівае Ігар Цітовіч.

І набірае ў адрасным радку ноўтбука камбінацыю сімвалаў, якая выводзіць на старонку Кансультатыўнай групы па падтрымцы Дарожнай карты для Рэспублікі Беларусь (Advisor Group on Support for the Belarus Roadmap). Пакуль уся асноўная, а таксама нарматыўная база размешчана па адрасе ag2.bsu.by.

Многія звесткі можна знайсці і на сайце Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі www.ehea.info.

## Іншы погляд

Тым часам Ad hoc камісія Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства і Грамадскі Балонскі камітэт падрыхтавалі справаздачу аб маніторынгу імплементацыі Дарожнай карты рэфармавання вышэйшай адукацыі Беларусі. Эксперты прыйшлі да высновы, што, па сутнасці, ні адно з абавязацельстваў, узятых беларускім бокам у 2015-м, не выканана цалкам і ў тэрмін. Сітуацыя з імплементацыяй Дарожнай карты ўскладнілася праз тое, што перспектывы разгляду новай рэдакцыі Кодэкса ў Нацыянальным сходзе адсунутыя на нявызначаны тэрмін.

Не ўносяцца і не абмяркоўваюцца змены і дапаўненні ў іншыя заканадаўчыя акты (Кодэкс аб працы, Крымінальны кодэкс, Грамадзянскі кодэкс, Закон «Аб грамадскіх аб'яднаннях» і інш.), якія маглі б забяспечыць імплементацыю абавязацельстваў Дарожнай карты. Многія вынікі міжнароднай экспертызы беларускай адукацыйнай палітыкі і заканадаўства, якая праводзілася ў рамках ЕПВА, не публікуюцца і застаюцца невядомымі грамадскасці. Гэта яшчэ пагаршае атмасферу інфармацыйнай закрытасці, якая характэрна для беларускай сістэмы вышэйшай адукацыі.

Аўтары справаздачы прыйшлі да высновы, што прагрэс можна назіраць толькі па двух з дзевяці найбольш значных грамадскіх чаканнях: балонскай архітэктуры вышэйшай адукацыі (пераход да трох прыступак: бакалаўр — магістр — кандыдат навук) і забеспячэнні аўтаматычнай бясплатнай выдачы дадатку да дыплома (Diploma Supplement).

Усё яшчэ не выкананымі альбо не завершанымі застаюцца абавязацельствы па стварэнні Нацыянальнай рамкі кваліфікацый, незалежнага агенцтва кантролю якасці, адмене размеркавання выпускнікоў, па пазбаўленні ад дыскрымінацыі ў прадастаўленні фінансавай дапамогі (льготных крэдытаў) студэнтам прыватных ВНУ, гарантыях акадэмічнай свабоды і пашырэнні інстытуцыйнай аўтаноміі (уключаючы пашырэнне студэнцкага ўдзелу ў кіраванні ВНУ), забеспячэнні права студэнтаў і выкладчыкаў на стварэнне і рэгістрацыю арганізацый (у прыватнасці, адмена артыкула 193.1 Крымінальнага Кодэксу) і, нарэшце, па зменах у існуючай сістэме выдачы дазволаў на паездкі з мэтай падаўжэння тэрмінаў знаходжання выкладчыкаў і студэнтаў у краінах ЕПВА без неабходнасці атрымання дазволу міністэрства.

Паколькі ва ўсталяваны тэрмін беларускія ўлады не змогуць нават наблізіцца да выканання сваіх абавязацельстваў, найлепшым выйсцем у такой сітуацыі эксперты лічаць працяг дзеяння Дарожнай карты на 2–3 гады з захаваннем міжнароднага кантролю за яе выкананнем.

**Інтэлігенты высокі юнак, нечым падобны да герояў Рэмарка, пасля выхаду з СІЗА вярнуўся да музейнай працы і намагаецца паспець аформіць новыя вітрыны, сабраць матэрыял для манаграфіі па даспеху часоў Рэчы Паспалітай — «пакуль зноў не закрылі». Мы працягваем серыю «непалітычных» размоваў з фігурантамі «Справы патрыётаў».**



*Помню неба...*
*Помню ў навальніцу бушаваў Рубон,*
*Шэр ракі ўскіпала ў берагах,*
*Гром зліваўся ў надабшарны стогн —*
*Тор свой молат уздымаў у руках*

*Дзіды бліскавіц ламаліс аб шчыты*
*Лес сцяной шчытоў стаяў, гатовы ў бой*
*Хай на рукі мне адзенуць кайданы,*
*Але тое неба... я заўжды нашу з сабой*
СІЗА, Мінск, 2017

# Алесь Зімніцкі: «Героем быць нескладана»



Алесь КІРКЕВІЧ

Алесю Зімніцкаму 25 гадоў, сам ён паходзіць з Докшыцкага раёна, але зараз жыве ў Мінску. Скончыў Ліцэй БДУ, Гістфак БДУ, Магістратуру БДУ, навучаецца ў аспірантуры Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы. Паралельна працуе ў Нацыянальным гістарычным музеі старшым навуковым супрацоўнікам, профіль — даспехі і вайсковы рыштунак.

Пра беларускія музеі, археалогію, рамантыку, грамадскую адказнасць і гераізм Алесь пагадзіўся распавесці чытачам «Новага Часу».

## Мужчына — найперш даследчык і заваёўнік

***— Адкуль у цябе цікавасць да гісторыі?***

— Пасля 6 класу я не паступіў у Сувораўскую вучэльню з-за дрэннага зроку і вырашыў, што вайсковая гісторыя — таксама цікавая рэч, вось і пайшоў па гэтым шляху. Тады я цікавіўся таксама фізікай і матэматыкай, але не зразумеў адной формулы, таму абраў гістфак.

***— Шырокі раскід цікавасцяў... Ты ўсё ж такі гуманітарый ці тэхнар?***

— Я дагэтуль не вызначыўся *(смяецца)*.. Прынамсі, вывучаючы гісторыю, пастаянна ёсць жаданне нешта сістэматызаваць, таму існуюць свае плюсы і ў такой будовы мыслення.

***— То бок не абстрактна-павярхоўны падыход да пытання, а...***

— Абстрактна-павярхоўна я вершыкі пішу *(смяецца)*.

***— Яшчэ і вершы?***

— Ведаеш, пакуль знаходзішся ў СІЗА, заняткаў асабліва не было, дык нешта там крэмзаў.

***— Ты таксама рэгулярна ўдзельнічаеш у археалагічных раскопках. Гэта цікавей за працу ў архівах?***

— Афіцыйна я ўсё ж такі гісторык, а не археолаг, але так склалася, што «сялянскую душу да зямлі цягне» *(смяецца)*. Калі сур'ёзна, то ў мяне традыцыйнае ўяўленне пра ролю мужчыны ў грамадстве: найперш, гэта даследчык, першаадкрывальнік, заваёўнік. А ў археалогіі матэрыялізуецца інстынкт пошуку нечага цікава — паляўнічы інстынкт, у нейкім сэнсе.

## Археалогія — рамантыка, карысная для грамадства

***— Як ты ўпершыню трапіў на раскопкі?***

— Звычайная археалагічная практыка, якую праходзяць усе студэнты гістфака. Гэта быў 2010 год, ля вёскі Лучна на Дзвіне. Капалі тады неўмацаваную феадальную сядзібу. Зноў жа, археалогія — гэта рамантыка, а там месца «намоленае», краявіды, вогнішча... так і зацягнула.

***— З таго часу — кожны год на раскопках?***

— Нават не так: той жа восенню, у 2010-м, мяне запрасілі на валанцёрскую экспедыцыю ў Дарошавічы пад Гродна. Там мы, праўда, нічога не знайшлі, хоць мелася быць стаянка каменнага веку *(смяецца)*. Затое, каля сядзібкі, дзе жылі, адкапалі невялікі скарб — адзін з нешматлікіх у Беларусі позніх скарбаў уж часоў Другой сусветнай. А так, я рэгулярна стараюся ездзіць.

Нядаўна бачыўся з адным сябрам, які пасля 6-гадовага перапынку з'ездзіў на экспедыцыю валанцёрам, пасля чаго сказаў: «Я шэсць гадоў ездзіў на Мальту, у Грэцыю адпачываць, а тут — такое!» Таму гэта аптымальнае сумяшчэнне занятку, цікавага мне асабіста і карыснага для грамадства.

## «Каштоўнасці захоўваюцца дзе давядзецца...»

***— Чалавек з тэхнічнымі здольнасцямі можа пайсці праграмістам ці распрацоўшчыкам кампутарных гульняў за добрыя грошы, а тут — музей... Чаму?***

— Усё проста: а хто, калі не я?

***— Музеі часцяком бачацца нечым кансерватыўным, дзе працуюць людзі, далёкія ад сучаснасці, ты сам сябе адчуваеш там на сваім месцы?***

— З аднаго боку, музей бачыцца нечым архаічным, з іншага — без музеяў мы не можам сабе ўявіць культуры паўнавартаснай незалежнай краіны. Свой мастацкі музей, вайскова-гістарычны, шэраг краязнаўчых... без гэтага і дзяржава — не дзяржава. Гэта і мінулшчына як фундамент суверэнітэту, і пытанне прэстыжу перад суседзямі.

Ёсць і мінусы, напрыклад, малы заробак, які выклікае шалёную ратацыю кадраў. Прыходзяць маладыя людзі, але, адбыўшы сваю адпрацоўку пасля ВНУ, сыходзяць, бо трэба заводзіць сям'ю, якую за музейны заробак не пракорміш. Крыўдна таксама, бо не заўсёды дзяржава ўяўляе, што роля музея — гэта таксама банальнае захаванне каштоўнасцяў. А ў нас ужо не першы дзясятак гадоў каштоўнасці захоўваюцца дзе давядзецца... Вельмі часта экспанаты ляжаць у звычайных скрынях, якія не паспяваюць разбіраць пасля шматлікіх пераездаў, альбо ў сховішчах, якія не адпавядаюць тэхнічным патрабаванням.



Алесь Зімніцкі прымярае на сябе рыштунак продкаў

***— Апошні момант — гэта пытанне набыцця новых вітрынаў пад экспанаты?***

— Гэта пытанне недафінансаванасці культуры як такой. Калі браць заходнія музеі, дык там, найперш, сам будынак выклікае захапленне і з'яўляецца каштоўнасцю. Там змяняецца і пастаянная экспазіцыя, і тэматычныя выставы. Людзі ходзяць у музеі раз за разам, бо калі ты не быў там год, то, калі прыходзіш у чарговы раз, бачыш нешта новае — табе зноў цікава.

Ёсць прыклад таго ж Ульмаў Германіі, дзе працуюць два цалкам розныя музеі. Адзін у ратушы — гэта музей архаічнага тыпу, іншымі словамі, склад. Заходзіш туды, і не ведаеш, на што глядзець, настолькі шчыльна там развешаныя па сценах алебарды, кірасы, расстаўлены па шафах срэбраны посуд і г.д. Кожны сантыметр нечым заняты! Усяго так шмат, што ты не можаш разглядзець асобныя рэчы.

Іншы музей — ва ўніверсітэце. Па фондах ён нашмат беднейшы за ратушу, бо гэта знаходкі студэнтаў падчас раскопак. Але там можна правесці часу больш, чым у ратхаўзе, настолькі цікава ўсё зроблена! Безліч схемаў, малюнкаў, усё зразумела, нават калі не валодаеш нямецкай мовай. Экспазіцыя пабудаваная на тым, што калі ёсць арыгінальная спражка, то пад яе зробяць малюнак альбо манекен, каб ты ўявіў, як гэта выглядала сотні год таму.

## Музей ВАВ — гэта цалкам еўрапейскі ўзровень

***— Такім чынам, галоўнае — не багацце экспанатаў, а спосаб данесці да гледача, інтэрпрэтацыя і падача?***

— Экспанаваць можна і адну рэч, і рабіць гэта крута. Багатыя фонды ці не — гэта не так важна. Сэнс у тым, каб экспанат хаця б захоўваўся ў нармальных умовах, каб пераважыць людзей, якія яго бачаць сёння. Па-другое — ён мае быць навукова вывучаны, бо Нацыянальна-гістарычны музей — не шараговы краязнаўчы. Тут экспанат — гэта яшчэ і навуковая крыніца. А як вывучаць, калі толькі за тры гады маёй працы фонды пераязджалі з месца на месца некалькі разоў? Дзе знайсці час займацца навукай, калі супрацоўнік працуе і грузчыкам, і ўпакоўшчыкам?..

***— Пытанне прафана: ці праўда, што беларускія музеі бедныя, бо за стагоддзі ўсё расцягнулі на Усход ці Захад?***

— Канешне, нам цяжка раўняцца на Луўр ці Эрмітаж, але і ў нас пры жаданні можна знайсці шмат цікавага. Пры гэтым, экспазіцыі можна рабіць наўпрост надзвычайныя, апра-

цоўваючы тое, што ёсць, — як у выпадку з універсітэцкім музеем Ульма. Ёсць у нас і вельмі багатыя музеі, той жа Музей ВАВ: па сваёй тэме там агромністая ўнікальная калекцыя, цалкам еўрапейскі ўзровень.

***— Ці мае музей нейкую місію?***

— Трансляваць дух мінуўшчыны сучаснікам, мабыць, і ёсць місіяй музея. Гэта атрымліваецца, няхай не заўжды так, як хацелася б, але працэс ідзе. Не варта забывацца, што мы выконваем і функцыю адукацыйнай установы, бо вялікае мноства наведнікаў — школьнікі. Кожны клас мінскай школы на нейкім уроку гісторыі прыходзіць у музей: дзеці пагарталі падручнік, паглядзелі ілюстрацыі, а тут — бачаць усё на ўласныя вочы. У спалучэнні з працай настаўніка і прафесіяналізмам экскурсавода — гэта дае плён. Праца з замежнікамі — гэта асобны накірунак: так мы дэманструем рэтраспектыўнае бачанне беларускай дзяржаўнасці.

***— Што можна зрабіць, каб удасканаліць тую ўстанову, дзе ты працуеш?***

— Больш інтэрактыву, медыйных тэхналогіяў, рэкламы. У польскіх музеях мне спадабалася, што некаторыя рэчы, напрыклад, копію шчыта, можна ўзяць у рукі, пафатаграфавацца, «бахнуць сэлфі» і выкінуць у фэйсбук. Адначасна гэта і рэклама для музея, і цікавостка для госця.

На тую ж «Ноч музея» можна запрашаць рэканструктараў. Дзеці любяць гаджэты, а ёсць той жа Кастусь Шыдлоўскі, які аднаўляе васковыя таблічкі, што выглядаюць фактычна як планшэт, але тысячагадовай даўніны. З гэтым таксама можна гуляцца, раскручваць, чаму не? Хай дзеткі пішуць стылом на воску, бавяцца — гэта ж успамін на ўсё жыццё.

### «Ніколі не думаў, што патрымаю ў руках карабін Сабескага»

***— Што б ты сказаў крытыкам, якія лічаць, што ў стагоддзе тэхналогіяў захаванне арыгінальных прадметаў — гэта перажытак, маўляў, усё можна алічбаваць, стварыць 3D-мадэлі ды разглядаць у любой кропцы свету?***

— Акрамя нейкай рамантычнай функцыі, «жывы прадмет» — гэта доказ таго, што рэч наўпрост існуе ў рэальнасці, а не толькі ў нейкай віртуальнай прасторы. Калі ты працуеш у музеі як даследчык — гэта ўжо нясе і цалкам навуковую функцыю. Здаецца, Ф. Андрашчук пісаў у кніжцы пра скандынаўскія мячы, маўляў, любы меч можна замаляваць, сфатаграфаваць, узважыць, правесці максімум аналізаў матэрыялу, але тэхналогіі не стаяць на месцы.

Хто ведае, магчыма, праз 50 ці 100 гадоў з'явіцца тэхналогія, дзякуючы якой з прадмета можна будзе выцягнуць яшчэ больш інфармацыі? А калі мы зараз усё сфатаграфавалі, алічбавалі, а сам артэфакт прадалі ці выкінулі на сметнік — нам наўпрост не будзе з чым працаваць. Рэальнасць заўсёды цікавейшая за віртуальнасць.

***— Ці былі нейкія экспанаты, якія выклікалі трымценне: трымаў ажно дрыжачымі рукамі?***

— Ніколі не думаў, напрыклад, што патрымаю ў руках карабін Яна Сабескага — гэта сапраўды некалі ўразіла. Мая слабасць — гэта даспех. Канешне, я ў кірасах не сплю і не хаджу на працу (смяецца), але цікава было даведацца, што шмат даспехаў часоў Рэчы Паспалітай захоўваецца ў нашым музеі, пры гэтым, фактычна дзесяцігоддзямі імі ніхто не цікавіўся і не займаўся. Гэта і кірасы, і турнірныя элементы, і шаломы — багата ўсяго. А дзе да гэтага можна дакранацца штодня, калі ты не заможны калекцыянер? Толькі ў музеі.



**Героем быць нескладана: можна памерці за Радзіму, можна адседзець у турме — гэта можа кожны, хто мае ўнутраны стрыжань і акрэсленыя прыярытэты. Іншая справа, гэта лямка адказнасці, якую ты цягнеш штодня, а таксама тысяча маленькіх каменьчыкаў, якімі ўмацоўваеш краіну і нацыю**

### Дружына — гэта зародак дзяржавы»

***— Чым ты займаешся ў навуковым плане? Я наконт вучобы ў аспірантуры...***

— Цалкам тэма гучыць як «Дружына ў працэсе палітагенеза на балта-славянскім памежжы ў X–XIII стагоддзях» Прасцей кажучы, старажытная дружына і адносіны з ранняй Літвой. Справа ў тым, што калі насельніцтва выбірала сабе князя альбо запрашала, як Рурыка, ён прыходзіў са сваёй камандай, якая мелася валадарыць на тэрыторыі. Гэта і кіраванне, і падаткаабкладанне, і судовая функцыя... То бок, дружына — гэта не толькі «брыгада», якая «крышавала» кагосьці, але і зародак дзяржаўных інстытутаў, на той час яна выконвала дзяржаватворную функцыю.

***— Чаму менавіта гэтая тэма?***

— Цікава было, што такое дзяржава па сваёй сутнасці і як яна з'явілася на нашых землях. Вядома, беларуская нацыянальная дзяржава з'явілася ў XX стагоддзі, але нашы карані — у Полацкім і Турава-Пінскім княствах, ВКЛ — гэта наша гісторыя. Важна данесці да людзей, што наша мінуўшчына — старажытная, цікавая і багатая на падзеі. Гэта і ёсць фундамент нашай незалежнасці.

Любая з'ява мае сваю перадгісторыю. І ў нашай гісторыі таксама ёсць як «Новы запавет», так і «Стары», у якім не заўжды ўсё проста. Але гэта як абавязковая прадмова ў кніжцы, без якой цяжка зразумець працэсы, што адбываліся пасля.

### Сціплы ўнёсак у дабрабыт грамадства

***— Сярод тваіх цікавасцяў таксама валанцёрства ў Чырвоным Крыжы... Чаму?***

— Пачну здалёк, троху пафасна. Дзяржава — гэта вышэйшая форма самаарганізацыі грамадства. У антычнасці ўсё было прасцей: ты плаціў падаткі, а ў выпадку вайны ішоў бараніць поліс — твая дзяржава заканчвалася за яго сценамі. Зараз гэтае паняцце досыць размытае, кожны чалавек жыве ў дзяржаве, карыстаецца бонусамі, часам ходзіць на выбары, калі яму цікава. Пры гэтым, ёсць шмат іншых момантаў, за кошт якіх жыве грамадства, — гэта незаўважныя і часам дробныя рэчы, якія мае рабіць кожны.

Для мяне пайсці валанцёрам у Чырвоны Крыж было выкананнем пэўнага грамадзянскага абавязку. Грамадства мне дае нейкія правы і бонусы, я маю даць нешта ў адказ. Улічваючы зменлівую сітуацыю ў свеце, умець аказаць першую дапамогу бліжняму свайму — гэта той навык, якім мае валодаць кожны, не толькі адмысловец. Добра, калі гэтыя веды не спатрэбяцца табе ніколі ў жыцці, але можа здарыцца адзін выпадак, калі без іх нехта (альбо нават ты сам) наўпрост не выжыве.





Гэта тое, што цябе не абцяжарвае, але можа быць дужа карысным. На практыцы аказваецца, што дапамагчы бліжняму гатовы далёка не кожны, а ведамі для гэтага валодае яшчэ менш людзей. Так я прыйшоў да высновы, што навучыцца самому, а пасля перадаць гэтыя навыкі іншым магло б быць маім сціплым унёскам у стабільнасць і дабрабыт грамадства і дзяржавы.

***— Як даўно ты гэтым займаешся?***

— Каля пяці гадоў. Спачатку прыходзіш валанцёрам, слухаеш семінар, выходзіш з пэўнымі ведамі. Пасля, калі бачыш навіны пра нейкія здарэнні ці канфліктныя сітуацыі, то ты пракручваеш у галаве: а як бы дзейнічаў сам? Як дапамагчы людзям у пэўных умовах? Так пачынаеш нешта пачытваць, а табе ўжо прапаноўваюць інструктарскія курсы — гэта ўжо не толькі дадатковыя веды для сябе, але магчымасць вучыць і іншых, адкрываць гэтую сферу для сяброў. Пытаюцца: «А колькі гэта часу?» А гэта ўсяго толькі семінар на адзін дзень, не так і шмат. Было б жаданне!

***— Асновы першай дапамогі нам усім, здаецца, выкладалі яшчэ ў школе...***

— Так, а пасля яшчэ ва ўніверсітэце. Але калі ў аўдыторыі сядзіць 20 маладых людзей, якія думаюць, як хутчэй пайсці піва папіць, — плёну, па-шчырасці, не багата. А на семінары «Чырвонага Крыжа» прыходзяць ужо ад пачатку матываваныя людзі, адпаведна, з цікавасцю слухаюць, задаюць пытанні. Яны ўжо ведаюць: умець аказаць дапамогу і дзейнічаць у экстрэмальнай сітуацыі — гэта і важна, і крута!

### «На свабодзе хачу шмат чаго паспець...»

***— Можа, падзелішся планамі на жыццё?***

— За тры месяцы ў зняволенні ў мяне прачнуўся пэўны трудагалізм *(смяецца)*. Паколькі справа яшчэ не завершаная, скласціся ўсё можа па-рознаму, я хачу паспець, пакуль я на свабодзе, рэалізаваць некалькі праектаў у плане музейнай працы. Гэта даследчыцкая праца па даспехах XVI–XVII стагоддзяў, у ідэале — падрыхтоўка манаграфіі. Таксама хачу папрацаваць на ўдасканаленне пастаяннай экспазіцыі музея, паўдзельнічаць у афармленні новых вітрынаў: па беларусах у вайне 1812 года, напрыклад.

***— То бок, ты па-іншаму пачаў ставіцца да свайго часу?***

— Так, бо зразумеў, што час — гэта рэсурс і пэўны капітал, да якога варта ставіцца сур'ёзна і адказна. Наогул, за перыяд знаходжання ў СІЗА я паспеў асэнсаваць шмат якія рэчы.

Героем быць нескладана: можна памерці за Радзіму, можна адседзець у турме — гэта можа кожны, хто мае ўнутраны стрыжань і акрэсленыя прыярытэты. Іншая справа, гэта лямка адказнасці, якую ты цягнеш штодня, а таксама тысяча маленькіх каменьчыкаў, якімі ўмацоўваеш краіну і нацыю. Памятаеце, як казаў бургамістр у фільме «Той самы Мюнхгаўзэн»: «А я на працягу 20 гадоў кожны дзень з раніцы іду на працу — я не скажу, што гэта подзвіг, але нешта геройчнае ў гэтым ёсць!» *(смяецца)*.

**Фота з асабістага архіву Алеся Зімніцкага**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### РАСІЯ. Пераемнікам Пуціна будзе Дзюмін?

Сярод расійскіх палітолагаў гуляе новая плётка — Уладзімір Пуцін можа ў апошні момант адмовіцца ад удзелу ў прэзідэнцкіх выбарах 2018 года і падтрымаць кандыдатуру тульскага губернатара Аляксея Дзюміна. Дзюмін, які нарадзіўся ў 1972 годзе, — генерал-лейтэнант, экс-намеснік міністра абарона. Праўда, сваёй кар'ерай ён, хутчэй, абавязаны таму, што быў начальнікам службы аховы Пуціна. Прыхільнікі версіі прэзідэнцтва Дзюміна спасылаюцца на шэраг прыкмет. Па-першае, гэта кантэнт вядучых каналаў тэлебачання, якія рэгулярна прэзентуюць насельніцтву тульскага губернатара ў вобразе саліднага і пазітыўнага палітыка. Гэта не характэрна для схемы афіцыёзу, якая працуе па формуле «добры цар і дрэнныя губернатары». Па-другое, выбары прэзідэнта Расіі пройдуць 18 сакавіка 2018 года, роўна ў «дзень уззяцця Крыма», і тут Дзюмін, які і камандаваў тады «ветлівымі чалавечкамі», вельмі дарэчы. Некаторыя палітолагі ўжо думаюць над слаганамі будучай кампаніі Дзюміна. Напрыклад, ёсць такі варыянт: «Вярнуў вам Крым, вярну і ўсё астатняе».

**Паводле расійскай прэсы**

### БРАЗІЛІЯ. Новыя парасткі сепаратызму

Народжаная падзеямі ў Каталоніі мода на сепаратызм працягвае трыумфальнае шэсце па планеце. У Бразіліі паўстаў рух за стварэнне асобнай дзяржавы на поўдні краіны. Новая краіна, як лічаць яе прыхільнікі, павінна ўключаць тры штаты: Рыу-Гранды-ду-Сул, Санта-Катарына і Парана. Усе яны вельмі заможныя, што і тлумачыць прычыны сепаратызму. Іх жыхары кажуць, што больш не жадаюць фінансаваць бедныя рэгіёны поўначы. Прычым вельмі хутка справа выйшла за межы блогаў у інтэрнэце. Літаральна за тыдзень паўстала сепаратысцкая арганізацыя «Поўдзень — мая радзіма», якая ўжо ўмудрылася правесці кансультатыўны рэферэндум за стварэнне новай дзяржавы. Праўда, ініцыятыва пакуль не выклікала вялікай падтрымкі. Па словах арганізатараў, галасаваць прыйшлі толькі тры працэнты насельніцтва паўднёвых штатаў. Аднак лідары руху настроеныя аптымістычна. На іх думку, усё вырашыцца ў наступным годзе, калі ва ўсіх штатах пройдуць выбары. Сепаратысты спадзяюцца атрымаць на іх колькасць мандатаў, якой хопіць, каб запусціць працэс падрыхтоўкі плебісцыту пра выхад рэгіёнаў са складу Бразіліі.

**Паводле амерыканскай прэсы**

### КАНАДА. Трамп знішчае канадскае ТБ



Джон Дойл, дырэктар Канадскага грамадскага тэлебачання, зрабіў незвычайную заяву. Ён растлумачыў татальнае падзенне інтарэсу канадцаў да мясцовага тэлебачання і яго кантэнту феноменам Дональда Трампа. На думку Джона Дойла, усё, што адбываецца вакол новага прэзідэнта ЗША, выглядае больш непрадказальна і інтрыгавальна, чым якая-небудзь драма або серыял, што дэманструюцца на канадскім тэлебачанні. Палітычны лёс Трампа абсалютна не прадказальны праз канфлікт з усёй элітай і праз яго вельмі экстравагантны характар. Гэта не адзіны фактар, які прымушае канадцаў глядзець амерыканскія навіны, а не канадскае кіно. Назіраючы за падзеямі ў Злучаных Штатах, канадцы кампенсуюць свой комплекс перад амерыканцамі, якія лічаць паўночных суседзяў нейкімі «калгаснікамі». Як прызнаўся Дойл, пакуль яго дырэкцыя не ведае, як выратаваць канадскія тэлеканалы ад Дональда Трампа.

**Паводле амерыканскай прэсы**

### ЛІТВА. За Грузіяй — Беларусь?

Некаторыя расійскія выданні пішуць, што Літва не абмяжуецца перайменаваннем Грузіі, якая з новага года будзе афіцыйна мець назву Сакартвела — так называюць сваю краіну самі грузіны. Нагадаем, што яшчэ пры Саакашвілі ў 2011 годзе грузінскі МЗС заклікаў іншыя дзяржавы выкарыстоўваць назву «Сакартвела». Тады гэты заклік пачула толькі Паўднёвая Карэя. Але вось цяпер чамусьці ўзгадала пра тую просьбу і Літва. Хутчэй за ўсё, перайменаванне Грузіі можна разглядаць як нейкі сімвалічны знак літоўскай падтрымкі грузінскіх супернікаў Масквы, лідарам якіх нефармальна лічыцца Міхаіл Саакашвілі. Аднак на гэтым чарга пераназванняў, быццам бы, не скончыцца. Паводле расійскіх прагнозаў, наступнай стане Беларусь, якую літоўцы, бывае, называюць Гудзія. Часам — нават у афіцыйных дакументах. Беларусь заменяць на Гудзію нібыта з-за жаху перад беларускай апазіцыяй, згодна з якой, «Літва» — скрадзеная літоўцамі назва, якая гістарычна належыць Беларусі. Чаму назва «Гудзія» прымусіць беларускіх нацыяналістаў назаўжды адмовіцца ад спадчыны ВКЛ, пры гэтым не паведамляецца.

**Паводле расійскай прэсы**




Фота www.triboona.ru

# Галівуд, гармоны і палітыка

Алег НОВІКАЎ

**Пасля цяперашняга скандалу Галівуд будзе іншым, піша амерыканская прэса. У тым ліку зменіцца яго роля ў палітычным працэсе як у ЗША, так і ў свеце.**

Калі пагаджацца з папулярным афарызмам пра тое, што прэса — чацвёртая ўлада, то Галівуд можна смела назваць пятай. «Фабрыка мараў» не толькі вырабляе і навязвае клішэ пазітыўнага і негатыўнага палітыка і фармуе стаўленне грамадства да нейкіх падзей — кіношнікі без усялякіх комплексаў умешваюцца ў самыя высокія палітычныя сферы.

Самы свежы прыклад — апошняя прэзідэнцкая гонка ў ЗША, калі ўся галівудская тусоўка аднагалосна агітавала за Клінтан, а славуты Роберт Дэ Ніра нават публічна абяцаў начысціць пысу кандыдату ад рэспубліканцаў. Баяцца Галівуду нават за мяжой: нядаўні антыпуцінскі ролік акцёра Мілана Фрыдмана прымусіў увесь расійскі агітпроп моцна панерваваццa.

Аднак цяпер часы, калі Галівуд дыктаваў свае правілы Беламу дому, засталіся ў мінулым. Мегаскандал вакол прадзюсара Харві Вайнштэйна, якога падазраюць у сексуальных злачынствах, нівеліюе вагу і думку акцёраў на палітычным рынку. Нагадаем, што Вайнштэйн тры дзесяцігоддзі схіляў да сексу галівудскіх акцёрак, якія атрымлівалі ролі ў яго карцінах. У расследаванні называюцца імёны 13 жанчын. Хутка стала вядома, што кастынгам у ложку займаўся не толькі Харві.

На самай справе, фігурантам аферы, па сутнасці, стаў кожны рэзідэнт Беверлі-Хілз. На думку прэсы, нават тыя, хто не быў ахвярай брудных заляцанняў Вайнштэйна, не маглі не ведаць пра яго ўчынкі. Аднак пры гэтым чамусьці маўчалі, што фактычна робіць іх саўдзельнікамі злачынства.

І гэта толькі пачатак спекуляцый. Некаторыя СМІ лічаць, што акцёркі — ахвяры гвалту Вайнштэйна, вынеслі смецце з хаты толькі таму, што ў прадзюсера пачаліся праблемы ў бізнесе. Не маючы ніякіх шанцаў граць у яго фільмах, яны адважыліся на споведзь.

Не менш за Вайнштэйна пацярпела ад гэтых споведзяў Дэмакратычная партыя ЗША, якой традыцыйна сімпатызуе Галівуд. Аматарам дэмакратаў быў і Вайнштэйн, які толькі з 2000 года перавёў на партыйныя рахункі больш за мільён долараў у якасці ахвяраванняў. Гэта без уліку трансфераў у фонд выбарчых штабоў розных кандыдатаў ад дэмакратаў. Фінансаваў Вайнштэйн і няўрадавыя арганізацыі накшталт праваабаронцаў, якім сёння сорамна глядзець людзям у вочы. Дэмакратычны выбарчы камітэт (DNC) ужо праінфармаваў, што ўсе датацыі, атрыманыя ад

**Вайнштэйн і іншыя кіношнікі-вычварэнцы — ахвяры сваіх фільмаў, дзе хапае гвалту і сексу. Таму гучыць заклік увесці ў Галівудзе маральную цэнзуру**

Вайнштэйна, будуць пераведзеныя на рахункі розных праваабарончых арганізацый, што, аднак, не астудзіла эмоцый.

Па сутнасці, праз Вайнштэйна дэмакраты губляюць рэнамэ партыі — абаронцы правоў жанчын, якія, дарэчы, актыўна за іх галасавалі. Узгадалі ў медыя і сямейства Клінтан у часы іх прэзідэнцтва. Біл Клінтан, прычым, з маўклівай згоды Хілары, паводзіў сябе з супрацоўніцамі адміністрацыі ў стылі Вайнштэйна, што дасюль не атрымала адпаведнай ацэнкі.

Затое на вуліцы рэспубліканцаў — свята. Няма сумневаў, што з цяперашнім іміджам Галівуд будзе менш актыўна ўдзельнічаць у розных палітычных кампаніях, у тым ліку супраць Дональда Трампа. У сувязі з гэтым дапускаюць, што публікацыя ў «The New York Times», пасля якой выбухнуў скандал, — аперацыя блізкіх да Трампа палітычны тэхнолагаў.

Некаторыя кансерватыўныя калумністы ідуць яшчэ далей. На іх думку, наспеў час рэформы ўсёй амерыканскай кінаіндустрыі. Логіка тут наступная: Вайнштэйн і іншыя кіношнікі-вычварэнцы — па сутнасці, ахвяры сваіх жа фільмаў, дзе хапае гвалту, сексу, наркотыкаў. Адсюль гучыць заклік увесці ў Галівудзе маральную цэнзуру, якая, мяркуюць, выратуе шмат жанчын ад асобаў, падобных да Харві.

Праўда, ёсць і тыя, хто спадзяецца, што скандал сціхне неяк сам па сабе. Яны ўзгадваюць, што падобныя рэчы ўжо мелі месца ў гісторыі амерыканскага кіно. Дастаткова ўзгадаць справу славутага Рамана Паланскага, якога дасюль намагаюцца прыцягнуць да адказнасці за згвалтаванне непаўнагадовай яшчэ ў 1970-х гадах. Час ад часу ад Еўропы, дзе хаваецца Паланскі, патрабуюць яго экстрадыцыі за акіян, што выклікае ажыятаж у СМІ, аднак пасля пра «подзвігі» рэжысёра зноў забываюць. У свой час удалося замяць скандал Мелу Гібсану, якога ўсе цураліся пасля яго гучных антысеміцкіх заяў. Ніколі не хаваў раманаў са сваімі акцёркам Вудзі Ален, аднак гэта чамусьці ўспрымалася іранічна.

Нарэшце, нельга не агучыць самы неверагодны прагноз, які выявіўся на старонках «US News». Пішуць, што драма Вайнштэйна, які пагадзіўся пайсці з усіх пасадаў пад ціскам грамадскасці, можа натхніць парламентароў у Вашынгтоне. Маўляў, яны могуць адважыцца запусціць працэс імпічменту Трампа. Праўда, аўтар артыкула лічыць, што наступствы такога кроку будуць трагічнымі для свету. У выпадку слуханняў наконт імпічменту, Трамп абавязкова паспрабуе адцягнуць увагу за кошт нейкай авантуры. Не выключаюць, што ён атакуе Паўночную Карэю або Іран з рызыкай выклікаць Трэцюю сусветную вайну.

# Нашы ў Чэхіі, або Вяртанне Бормана

Алег НОВІКАЎ

**Андрэй Рамашэўскі па мянушцы Борман, лідар беларускай Партыі аматараў піва, які быў вымушаны эміграваць у Чэхію, вярнуўся ў палітыку. Праўда, пакуль у чэшскую. Ён балатуецца ад Партыі піратаў у мясцовы парламент, выбары ў які пройдуць 21 кастрычніка.**

**Пра пачатак новай палітычнай дзейнасці Андрэй распавядае чытачам «Новага Часу».**



Фота з Facebook Андрэя Рамашэўскага

***— У тваёй біяграфіі, змешчанай на партыйным сайце, гаворыцца, што апошнія 20 гадоў ты быў па-за палітыкай. Што прымусіла зноў заняцца гэтай няўдзячнай справай?***

— Чалавек можа выдатна ўстрымлівацца ад актыўнага палітычнага жыцця. Асабліва калі мае шмат працы, вялікую сям'ю, гаспадарку. Але заўсёды хочацца чагосьці большага — нейкага драйву, новых сяброў, успомніць рэвалюцыйную маладосць, урэшце... Назіраць за палітычным жыццём бывае вельмі цікава. А рабіць яго — яшчэ цікавей.

***— Чаму ты абраў менавіта Партыю піратаў?***

— Адна з прычынаў, чаму я так доўга ўстрымліваўся ад палітыкі, — тое, што не было партыі, з якой бы мне гэта хацелася супрацоўнічаць. Палітычнае жыццё ў Чэхіі традыцыйна лічыцца экстрэмальна брудным і амаральным бізнесам. Паводле сацыялагічных апытанняў, нават чорнарабочы на будоўлі ці асенізатар маюць у вачах грамадзян вышэйшы рэйтынг. І раптам з'явіліся «піраты», якія, здаецца, нясуць змены.

***— Чэшская Партыя піратаў — гэта, без сумневаў, феномен. Заснаваная ў 2009 годзе структура ледзь не трапіла ў Еўрапарламент, ужо мае сенатара, бургамістра. Зараз у яе добрыя шансы стаць парламенцкай партыяй. Чаму арганізацыя, якая пазіцыянуе сябе як абаронцу правоў і свабод у інтэрнэце, знайшла адносна вялікую падтрымку ў чэшскім грамадстве?***

— Нават калі б Партыя піратаў засталася ў нішы абароны свабоды слова ў інтэрнэце, яна б і тады мела пэўныя шанцы. Але недастаткова для таго, каб выйсці ў вялікую палітыку. Таму «піраты» высадзіліся на бераг і пачалі пашыраць свае ідэалы ў рэальным свеце. Першым была поўная адкрытасць — у нас няма закрытых унутрыпартыйных дыскусій, усё рашэнні абмяркоўваюцца і прымаюцца на кожным адкрытым партыйным форуме. У нас няма патаемных спонсараў — кожная крона, якую атрымлівае партыя, бачная на транспарэнтным рахунку. У атмасферы татальнай карупцыі, кліенталізму і хлусні — гэта рэчы, якія даюць Партыі піратаў вельмі вялікі крэдыт даверу. Ёсць шмат людзей, якія разыходзяцца з намі па шматлікіх праграмных рэчах, але наша адкрытасць прыцягвае і іх. А пасля такіх асобаў працей перакананаць і праграмна.

***— Як арганізаваныя парламенцкія выбары ў Чэхіі? Ці ёсць у цябе шанец стаць дэпутатам?***

— Парламенцкія выбары ў Чэхіі адбываюцца паводле прапарцыйнай сістэмы. Краіна падзеленая на 14 краёў — адміністрацыйных адзінак, што адпавядаюць беларускай вобласці, але крыху меншыя. Кожнаму краю належыць пэўная колькасць мандатаў (у залежнасці ад колькасці насельніцтва). Рэгіянальныя партыйныя арганізацыі ствараюць свае спісы. Па выніках выбараў лічыцца, колькі назбіралі партыі па краіне наогул. Тыя, што не маюць 5%, выходзяць з гульні. Галасы, атрыманыя гэтымі партыямі, дзеляцца паміж пераможцамі. А пасля пачынаюць дзяліць мандаты ў краях паводле лакальных галасоў. У нашым (Пардубіцкім) краі я на шостай пазіцыі ў партыйным спісе. Каб стаць дэпутатам, трэба атрымаць вельмі шмат — працэнтаў 40.

***— А як чэшскія выбаршчыкі ставяцца да таго, што ў парламент іх краіны ідзе этнічны беларус?***

— Большасць выбаршчыкаў пра гэта не даведаецца. Нацыянальнай ці рэлігійнай прыналежнасці кандыдатаў у бюлетэнях няма. А чытаць поўныя біяграфіі на партыйных сайтах цікава мала каму. Галасуюць пераважна за партыю альбо за партыйнага лідара.

***— У еўрапейскай прэсе можна пабачыць тэксты, у якіх гаворыцца, што гэтыя выбары для Чэхіі — фатальныя. Маўляў, пасля іх Чэхія ўвойдзе ў клуб краін, дзе моду задаюць папулісцкія партыі. Маецца на ўвазе, што фаварыт выбараў — партыя ANO 2011, якая, па сутнасці, ёсць асабістым праектам алігарха Андрэя Бабіша. Ці варта спяваць рэквіем па чэшскай дэмакратыі?***

— Партыя Бабіша — папросту прыватная алігархічная структура, якую можна было б параўноўваць з партыяй Лукашэнкі, калі б тая існавала. Значна больш небяспечным, мне падаецца, ёсць рост нацыянал-папулісцкай (зноў жа, прыватнай) партыі Томіа Акамуры, якая штурмуе рубеж у 10%. Акамура — прафесійны дэмагог, які будуе кампанію на ксенафобіі і ісламафобіі, заклікае да выхаду з ЕС, падтрымлівае анексію Крыма і гэтак далей. Ён, а не Бабіш, выступае сілай, якой палохаецца Еўропа. Не выключана, што пасля выбараў Бабіш і Акамура створаць кааліцыйны ўрад. Так што гэта яшчэ не рэквіем па дэмакратыі, але сітуацыя вельмі цікавая.

***— Што ўяўляе сабой беларуская грамада ў Чэхіі? Каму яна сімпатызуе на гэтых выбарах?***

— Беларуская грамада не вельмі кансалідаваная. Большасць беларускіх актывістаў жыве ў Празе, дзе мяне няма. Акрамя таго, ёсць некалькі беларускіх суполак у фэйсбуку. Як звычайна бывае, дзе два беларусы — там тры партыі. Думаю, што сваіх беларускіх сімпатызантаў мае хіба не кожная чэшская партыя з 31-й, што бяруць удзел у гэтых выбарах.

***— Ці дапускаеш ты варыянт вяртання на радзіму? Калі так, у якой якасці? На тваю думку, ці магчыма аднавіць у Беларусі Партыю аматараў піва?***

— У якасці пенсіянера. Партыю адрадзіць можна і трэба. Але выключна пры ўмове працуючых дэмакратычных механізмаў і прапарцыйнай выбарчай сістэмы.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### Нікалас Мадура



Кіраўнік Венесуэлы ўзмацніў свае пазіцыі ў супрацьстаянні з апазіцыяй. Паводле апошніх афіцыйных дадзеных, падчас праведзеных выбараў губернатараў праўладная «Адзіная сацыялістычная партыя» выйграла выбары ў 17 штатах краіны, апазіцыя — у пяці. У выніку за чавістаў галасавалі 54 працэнты, а за апазіцыянераў — каля 45. З улікам глыбіні эканамічнага крызісу, што пануе ў краіне, такія лічбы падаюцца парадаксальнымі. Не кажучы пра тое, што на апошніх парламенцкіх выбарах перамагла апазіцыя.

Не дзіўна, што апаненты Мадуры адмовіліся прызнаваць вынікі ЦВК. Паводле апазіцыянераў, падчас галасавання мелі месца масавыя фальсіфікацыі. Аднак нейкая логіка ў перамозе Мадуры прысутнічае. Напярэдадні ён замарозіў кошты на некаторыя прадукты, што трошкі стабілізавала сітуацыю на рынку.

Так ці інакш, вынікі выбараў зблыталі карты праціўнікаў Мадуры. Пасля таго, як улетку кіраўнік Венесуэлы разагнаў парламент, лічылася, што ў Венесуэле паўстала дыктатура, з якой трэба змагацца нават шляхам інтэрвенцыі. Цяпер сітуацыя не такая адназначная. Калі бліжэйшым часам нічога не адбудзецца, Мадура зможа больш-менш спакойна падрыхтавацца да прэзідэнцкіх выбараў 2018-га.

### Енс Спан



Сябра нямецкага Хрысціянска-дэмакратычнага саюза, які лічыцца лідарам унутрыпартыйнай правай фракцыі, атрымаў рэальны шанец сарваць аперацыю «пераемнік», якую Меркель плануе правесці бліжэйшым часам.

Спан можа стаць новым лідарам партыі, піша нямецкая прэса. Пачаць можна са слабых вынікаў ХДС на зямельных выбарах у Ніжняй Саксоніі 15 кастрычніка, дзе партыя атрымала каля 31 працэнта галасоў. Правал выклікаў чарговы ўраган крытыкі на адрас Меркель, якая ў сваю чаргу вымушаная весці цяжкія перамовы наконт стварэння агульнай кааліцыі з «Зялёнымі» і лібераламі.

Яшчэ больш шанцы Спана выраслі за кошт апошніх парламенцкіх выбараў у Аўстрыі. Нагадаем, што іх пераможцам сталі кансерватары пад кіраўніцтвам 31-гадовага Себасцьяна Курца. Праўда, у адрозненне ад нямецкіх кансерватараў, Курц і яго аднапартыйцы ставяць пад сумнеў забабоны Меркель — крытыкуюць міграцыйную палітыку ЕС і ФРГ, заклікаюць сябраваць з Расіяй, фліртуюць з мясцовымі еўрафобамі.

Паколькі Спан і Курц — сябры, Вена ператвараецца ў сімвалічную альтэрнатыву Меркелеўскай мадэлі кансерватызму. Сам Спан кажа, што правал кааліцыйных перамоваў, якія Меркель планавала закончыць да Калядаў, можа стаць сігналам да запуску змены партыйнага кіраўніцтва.

### Вадзім Рабіновіч



Народны дэпутат Украіны, лідар партыі «За жыццё», якая паўстала на базе адной з фракцый «Партыі рэгіёнаў», нечакана заявіў, што яго збіраліся забіць.

Прычым замах намагаліся зрабіць не нацыяналісты-майданаўцы, якіх актыўна крытыкуе палітык, а сябры партыі «Апазіцыйны блок», з якой выйшаў сам Рабіновіч. Паводле словаў палітыка, апаненты намагаліся арганізаваць падпал яго дома. Ён таксама назваў прозвішчы лідараў «Апазіцыйнага блоку» Сяргея Лёвачкіна і Юрыя Бойкі ў якасці датычных да замаху.

Словы Рабіновіча сведчаць пра глыбокі крызіс партый, якія абараняюць інтарэсы поўдня і ўсходу Украіны, дзе знаходзіўся электаральны базіс Януковіча. Лічыцца, што прычына крызісу — спрэчкі паміж спонсарамі «Апазіцыйнага блоку». Напрыклад, данецкі алігарх Рынат Ахметаў раптам пасябраваў з Парашэнкам і патрабуе ад сваіх дэпутатаў у складзе «Апазіцыйнага блоку» падтрымліваць антысацыяльныя законапраекты, што не падабаецца іншым.

Апартунізм пострэгіяналаў і асабістыя канфрантацыі, якія перайшлі на ўзровень замахаў і падпалаў, ставяць крыж на будучыні партыйных праектаў, якія выйшлі з «Партыі рэгіёнаў». Праўда, што ідзе ім на змену — незразумела.

Застаецца дадаць, што сам Вадзім Рабіновіч — гэта нейкі цуд нават для ўкраінскай палітыкі. Яго рэйтынг часам дасягае 5–6 працэнтаў, хаця ў асноўным ён вядомы не заканадаўчай практыкай, а як з'едлівы вядучы папулярнай праграмы на адным з каналаў тэлебачання.

# «Каб ніводнага кулака не засталося...»

Таццяна ПРОЦЬКА

**Заканчэнне.**
**Пачатак у № 38**

*«У калгасе добра жыць —*
*адзін косіць, сем ляжыць.*
*А як сонца прыпячэ,*
*дык апошні ўцячэ».*

## Статыстыка і людзі

Згодна з рашэннямі Тройкі ПП АДПУ па БССР, у 1930 годзе высяленню за межы БССР падлягалі 1931 сям'я — 8208 чалавек. З памежных акруг Мінскага, Полацкага, Бабруйскага і Мазырскага раёнаў меркавалася вывесці 59,2% усіх кулакоў — 1143 сям'і, з астатніх 19 памежных раёнаў — 463 сям'і (24%).

Рэальнае высяленне было іншым. 5519 чалавек загрузілі ў тры з паловай эшалоны — 141 «людскі» і 34 багажныя вагоны. «Недагруз 1 ½ эшалона (77 людскіх вагонаў) адбыўся з-за адсеву — за кошт старых, дзяцей і збольшага хворых, якія засталіся на месцы. Лішняя колькасць загружаных багажных вагонаў адбывалася выключна з-за параўнальна вялікай нормы дазволенага да правозу кожнай сям'і багажу (30 пудоў на сям'ю — запас трохмесячнага харчавання)», — рапартавалі беларускія чэкісты ў Маскву.

У красавіку — чэрвені 1931 года да высялення былі прыгавораны 5000 сем'яў кулакоў. З 1 па 14 чэрвеня на Урал штодня адпраўлялася па эшалоне. Дзяцей да 10 гадоў і старых дазвалялася пакідаць у сваякоў. Сем'і кулакоў, якія не мелі працаздольных мужчын, высяленню не падлягалі.

У другой палове 1931 года да высылкі запланавалі яшчэ 5671 сям'ю з 61 раёна БССР. Рэальна было выселена 5664 сям'і, ці 22 670 чалавек. «Уся работа праводзіцца ў парадку паведамленага СПА АДПУ плана НР952», — тэлеграфавалі ў Маскву беларускія чэкісты.

Заўважу, што праца спецслужбаў у тыя гады вялася заўсёды згодна з планамі. З Масквы, Мінска сыходзілі ці канкрэтныя лічбы, ці працэнты людзей, якія падлягалі рэпрэсіям. Недавыкананне плану суправаджалася тлумачэннямі.

У наступныя гады высяленне кулацтва працягвалася яшчэ больш маштабна. Напрыклад, з 5 па 15 мая 1933 года падлягалі высяленню 8316 сем'яў з колькасцю душ — 30 410 чалавек і 243 «адзіночкі». Памеры раскулачвання на ліпень 1934 года былі даведзеныя ў Маскву сакратаром ЦК КП(б)Б Гікалам: 35 тысяч сем'яў.

З-за недаступнасці архіваў КДБ РБ, дакладная колькасць пацярпелых ад калектывізацыі людзей не ўстаноўлена. Агульнапрынятымі лічацца: раскулачылі ад 48 да 64 тысяч сем'яў, рэпрэсавалі ад 297,8 да 396,8 тысячы чалавек.

## І стукацтва...

«Кулакі», пераселеныя ў Расію, імкнуліся збегчы адтуль на Радзіму. Каб спыніць гэты працэс, АДПУ выдала адпаведны загад (№223/106). Тых, хто збег, абавязкова трэба было вярнуць і пакараць.

Мясцовыя жыхары, якія затрымалі ўцекачоў-кулакоў, атрымлівалі грашовую ўзнагароду «за кошт утрымання з заробку злоўленых кулакоў». Для заахвочвання затрымання дазвалялася «выкарыстанне рэшткаў сумаў ад спецыяльных асігнаванняў на высяленне кулакоў». Тых, хто ведаў пра «збеглых», але не данёс, судзілі па артыкуле «за неданясенне». Частку маёмасці кулака атрымлівалі тыя, хто на яго данёс.

Наступствамі прымусовай калектывізацыі былі выпадкі супраціву сялян. У БССР, у адрозненне ад Украіны, масавых выступаў не было. Аднак сказаць, што высяленні адбываліся зусім пакорна, нельга. Толькі за чэрвень 1930 года, паводле дадзеных АДПУ па БССР, адбыліся 3 забойствы, 4 раненні, 3 замахі, 6 выпадкаў збіцця актывістаў, 48 падпалаў, арыштавалі 32 чалавекі. У жніўні адбыліся 26 падпалаў, забіта 3, арыштавалі 52 чалавекі.

## Нават у калгасах

«Пошук ворагаў у калгасах» — так афіцыйна называліся масавыя рэпрэсіі сярод сялян, служачых і інтэлігенцыі, звязаных з сельскай гаспадаркай.

Максімальны размах гэтая кампанія мела ў 1932–1934 гадах. Прававой асновай для масавых рэпрэсій з'яўляўся Крымінальны Кодэкс і Пастанова ЦВК і СНК СССР ад 7 жніўня 1932 года «Аб ахове маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і каапераці і ўмацаванні грамадскай (сацыялістычнай) уласнасці», прынятая па ініцыятыве Сталіна. За крадзеж калгаснай і кааператыўнай маёмасці, крадзеж грузаў на чыгуначным і водным транспарце закон прадугледжваў расстрэл з канфіскацыяй маёмасці, які пры змякчальных абставінах мог быць заменены пазбаўленнем волі на тэрмін не менш за 10 гадоў з канфіскацыяй маёмасці. У якасці «меры судовай рэпрэсіі» па справах аб ахове калгасаў і калгаснікаў ад гвалтаў і пагрозаў з боку «кулацкіх элементаў» для апошніх прадугледжвалася пазбаўленне волі на тэрмін ад 5 да 10 гадоў. Асуджаныя па гэтым законе не падлягалі амністыі.

Для ўвядзення такіх жорсткіх законаў былі, перш за ўсё, эканамічныя прычыны. У «Тэзісах да дакладу аб палітычным стане рэспублікі і аператыўнай працы органаў ПП АДПУ з 1.05.32 па 1.05.33 г.», накіраваных у Маскву, паказвалася галоўная прычына рэпрэсій — асноўныя паказчыкі развіцця сельскай гаспадаркі знізіліся, і ў цэлым выкананне кампаній і мерапрыемстваў за май-снежань 1932 года было ацэнена як «зрыў і недавыкананне». Чэкісты канстатавалі: у 1932 годзе хлебанарыхтоўкі выкананыя на 66%, нарыхтоўка насення — на 34,3%, памольныя зборы — на 38,3%, льназдача — на 38,2%, мясанарыхтоўка — на 73,9%, нарыхтоўка бульбы — на 74,1%. Акрамя таго, з калгасаў выйшлі 43 155 гаспадарак, распаліся 867 калгасаў, калектывізацыя знізілася на 10,2%.



**У міліцэйскі пастарунак дастаўлены спекулянт. Мінск, 1930-я гады.**
Фота з кнігі Таццяны Процька «Станаўленне савецкай таталітарнай сістэмы ў Беларусі (1917–1941)»

ПП АДПУ па БССР у пошуку «ворагаў у калгасах» мела чатыры асноўныя мэты: «чыстку» калгасаў ад асобаў, апазіцыйна або варожа настроеных да існуючага парадку, барацьбу з раскраданнем калгаснай уласнасці, кантроль за працай кіраўнічых структур і эфектыўнасцю іх працы па выкананні дырэктыў РКП(б) — КП(б)Б, ліквідацыю ачагоў магчымага супраціву.

Чысткі калгасаў, як правіла, пачыналіся з аналізу дзейнасці калгаснай і раённай кіраўнічай эліты, затым членаў КП(б)Б. У «Спецзводцы аб прыцягненні да адказнасці членаў і кандыдатаў КП(б)Б за сабатаж дзяржаўных мерапрыемстваў і зрошчвання з кулакамі», падрыхтаванай АДПУ па БССР 8 студзеня 1933 года, указвалася, што за час з 15 снежня па 4 студзеня, паводле дадзеных з 57 раёнаў БССР, выключана з партыі 998 чалавек, з якіх арыштавана і аддадзена пад суд 325 чалавек, з іх 4 старшыні райвыканкамаў, 103 старшыні сельсаветаў, 90 старшыняў калгасаў, 26 членаў сельскіх саветаў, 11 дырэктараў саўгасаў, 5 кіраўнікоў МТС, 85 членаў праўлення калгасаў, 14 намеснікаў старшыняў і сакратароў сельскіх саветаў. Мясцовая кіруючая эліта, дарэчы, як і сёння, першая несла цяжар рэпрэсій.

У пачатку 1933 года агентурны і асведамляльны апарат ПП АДПУ па БССР быў задзейнічаны для правядзення «шырокай аперацыі па арганізацыі ў кадрах кулацкай контррэвалюцыі». На абласныя ўпраўленні былі спушчаныя планы «выяўлення ворагаў у калгасах». Яны грунтаваліся на «усталяванай колькасці шкоднікаў» — 4–6% працаздольнага сялянства.

Найбольш масавымі арышты былі ў студзені-лютым 1933 года. 23 красавіка 1933 года супрацоўнікі Асобага аддзела дакладвалі аб ліквідацыі 24 груп (1148 чалавек), 29 рэзідэнтур (277 чалавек), 93 контррэвалюцыйных паўстанцкіх груповак (1163 чалавекі), 21 контррэвалюцыйнай шкодніцкай групы (248 чалавек), 18 бандыцкіх груповак (136 чалавек). Акрамя таго, «ліквідавалі» 1188 адзіночак. Яшчэ на 4299 чалавек «вяліся справы». На 7 лютага былі арыштаваныя 22 352 асобы, на 10 лютага — ужо 23 544. За тры дні было арыштавана 1192 чалавекі!

Толькі ў першай палове 1933 года Тройкай ПП АДПУ да расстрэлу асуджана 2158 чалавек, да лагераў — 8617 чалавек, да высылкі — 2487 чалавек, а 1448 спраў на 5794 чалавекі перададзена ў НК юстыцыі. Трэба было «асудзіць» яшчэ 26 957 чалавек «улічанага кулацкага і а/с элементу». Рэпрэсіямі была ахоплена ўся рэспубліка.

Рэпрэсіўныя дзеянні спецорганаў былі паспяховымі — з пункту погляду савецкай дзяржавы. Да 1 мая ў калгасы ўвайшла 38 071 гаспадарка, было створана 417 калгасаў. «Упершыню за час існавання Савецкай Беларусі былі выкананыя асноўныя гаспадарча-палітычныя кампаніі», — рапартавалі беларускія чэкісты ў Маскву.

Чысткі сялян працягваліся да канца 1930-х гадоў. Аднак маштабы іх былі значна меншыя, чым у 1932–1933 гадах. Як правіла, сялян уключалі ў шпіёнскія і тэрарыстычныя арганізацыі, ім інкрымінавалі дзеянні ўжо не па развале калгасаў, а ў адпаведнасці з профілем «шкодніцтва ў сістэмах жывёлагадоўлі, льнаводства, ветэрынарыі, сельгаснарыхтовак, землярobства, механізацыі сельскай гаспадаркі, лясной гаспадаркі. Так, з 20 снежня па 5 лютага 1935 года былі ліквідаваныя 129 тэрарыстычных арганізацый (598 чалавек), 1281 тэрарыст-адзіночка. Асабліва адзначу — гэтыя рэпрэсіі ажыццяўляліся ў Беларусі яшчэ да крывавага 1937 года.

## Нябачныя наступствы

Наступствамі актыўнай «ліквідацыі кулацтва як класа» стаў масавы рост дзіцячай беспрытульнасці, рост крымінальнай злачыннасці. У дакладной запісцы, накіраванай у ЦК КП(б)Б і СНК БССР кіраўнікамі партыйнай арганізацыі Жлобінскага раёна 5 ліпеня 1933 года, паказвалася, што 216 гаспадарак з 885 чалавекамі «падвергліся адміністрацыйна-судоваму пакаранню з боку органаў ДПУ і суда з канфіскацыяй маёмасці. Гэтыя сем'і ў сваёй пераважнай большасці знаходзяцца ў раёне і жывуць за кошт жабрацтва, ходзяць па дамах». Кіраўнікі раёна не ведалі, што рабіць з гэтымі сем'ямі, і пыталіся пра гэта ў кіраўніцтва краіны.

Маштабы бездагляднасці і звязаная з ёй дзіцячая злачыннасць сталі настолькі значнымі, што ў 1935 годзе барацьбой з беспрытульнасцю дзяцей сталі займацца чэкісты. Толькі за красавік 1935 года ў БССР «канфіскавана з вуліц у гарадах, раённых цэнтрах і рабочых пасёлках 2243 бездаглядных, 58 з якіх былі прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці ў ліпені, 191 — у маі, 103 — у чэрвені. У жніўні «изъято» 670 дзяцей, 42 з якіх — асуджаныя.

Пасля дзеці накіроўваліся ў размеркавальнікі і дзіцячыя дамы. У мэтах барацьбы з беспрытульнасцю « наладжваецца агентурнае абслугоўванне дзіцячых устаноў з задачай выяўлення засмечанасці сярод педагагічнага калектыву і выкрыцця недахопаў у выхаваўча-педагагічнай працы і гаспадарчай падрыхтоўцы справы», — паведамлялі ў Маскву беларускія чэкісты аб мерапрыемствах па барацьбе з беспрытульнасцю.

Варта адзначыць, што сучасныя працаўнікі беларускіх спецслужбаў надзвычай ганарацца роляй НКУС у ліквідацыі бездаглядных — архіўныя справы, якія змяшчаюць інфармацыю аб гэтай дзейнасці, можна атрымаць без абмежаванняў.

Калектывізацыя і раскулачванне знішчылі ў сялян жаданне прадукцыйнай працы. Ужо ў 1930-я гады папулярнай была прыпеўка: «У калгасе добра жыць — адзін косіць, сем ляжыць. А як сонца прыпячэ, дык апошні ўцячэ». Некалькі пакаленняў беларускіх сялян выраслі з ідэямі не пазітыўнасці калектыўнай працы, а з ідэямі — усё навокал «не маё» і адпаведнымі адносінамі да гэтага.

Сельская гаспадарка краіны так і не акрыяла ад рэпрэсій 1930-х гадоў. Яна застаецца калектыўнай, а «кулакоў» вярнуць у вытворчасць не вельмі і атрымліваецца.

# Успаміны: Пад негалосным апякунствам

Арсень ЛІС

**Было тое ў верасні 1973 года. Называю час, пару года, бо ўсё ж не абыдзенная і не мяне аднаго тады чакала прыгода, гісторыя.**



**Злева направа: Іван Ціішчанка, Арсень Ліс , Сцяпан Міско. Мінск, 1969 год.**
Фота з сямейнага архіву Арсеня Ліса

Напярэдадні якраз зайшоў быў на Акадэмічную, 15, дзе ўжо каторы год у спецыяльна збудаваным пяціпавярховіку працаваў калектыў навукоўцаў над стварэннем першай беларускай энцыклапедыі. Зайсці ж звычайна трэба было для таго, каб аднесці заказаны супрацоўнікамі энцыклапедыі тэкст, вычытаную карэктуру.

На той час я радасна-шчыра быў захапіўся жыццём і працай вучоных, культурна-асветных дзяячоў і некаторых грамадска-палітычных дзеячаў Беларусі, асобаў светлых, таленавітых творцаў. Напісаў ужо быў некалькі нарысаў-партрэтаў іх, апублікаваў дзве манаграфіі. А ў цэлым жа ў энцыклапедычным выданні — гэтым аўтарытэтным, рэпрэзентатыўным пашпарце нацыі — было важна як найпаўней агледзець дзеі беларускага народу цягам тысячагадовай яго гісторыі, сцісла падаць здабыткі беларускай думкі і працы, здзейсненых безліччу ягоных прадстаўнікоў.

Таго вышэй згаданага дня я кіраваўся ў рэдакцыю літаратуры БелСЭ. У ёй на той час працавалі Янка Саламевіч, Валянцін Рабкевіч і Міхась Шавыркін. Гэтым разам застаў адно Вальку Рабкевіча, які адразу, на парозе, сустрэў мяне пытаннем:

— Янка табе нічога не перадаваў?

— Не, а што?

— Выклікалі ў КДБ. Падчас гутаркі ўспаміналі і цябе. Відаць, могуць выклікаць...

Я не паспеў распытаць, чаго выклікалі, што пыталіся. У пакой зайшоў супрацоўнік суседняй рэдакцыі па нейкай для яго пільнай справе.

Назаўтра з раніцы на работу ў інстытут — званок і запрашэнне-наказ мне прыйсці ў Камітэт дзяржбяспекі. Пытацца чаго з увагі на строгую ўстанову не выпадала. Адно толькі сказаў, што магу зрабіць гэта назаўтра, з чым незнаёмы абанент без замінкі згадзіўся.

Ля ўваходу з боку вуліцы Леніна ў паважны будынак на праспекце (пра яго казалі, што адтуль далёка відаць) службовец у цывільным даў пропуск і павёў кудысь угору — на другі ці трэці паверх. Хутка апынуліся ў прадаўгаватым нешырокім пакоі. Лагодна-ветліва запрошаны сесці, я апынуўся за сталом твар у твар перад чалавекам, які назваўся па імені і па бацьку.

З першых яго пытанняў зразумеў, што «нашчупваецца» кола маіх сяброў, бліжэйшых знаёмых. Прызнацца, адразу не зарыентаваўся ў мэце запросін мяне ў гэту, што ні кажы, няпростую, паважную ўстанову. Адно з больш канкрэтных пытанняў было пра Уладзіміра Караткевіча. Я шматслоўна разгаварыўся пра творчасць улюбёнага свайго аўтара, суб'ектыўна аддаючы перавагу яго паэзіі, робячы некаторыя заўвагі па прозе: маўляў, часам дапускае сумяшчэнне падзей у часе. І нічога як пра асобу, сябра. Пазней даведаўся, што Валодзя, калі яго запыталі пра дачыненні з Ар. Лісам, выказаўся разумна, у кантэксце сітуацыі і амаль афарыстычна: «А што ў нас з Лісам можа быць агульнага: я п'ю, а ён не п'е?» Мне ж такога досціпу не хапала ў той сітуацыі, хоць чуўся зусім спакойна. Адно, не адчуваў за сабой ніякай віны, якую можна было б кваліфікаваць як нейкі крымінал. А па-другое, нечакана ўдалося падстрахаваць сябе на выпадак лішняга нервовага напружання — усё ж выклікала неардынарнае ведамства.

Пасля Караткевіча мой візаві пытаўся пра Сцяпана Міско. Мільганулі ў галаве Сцёпавы публічныя заступніцтвы за беларускую мову, казаныя горача, хапатліва. Успомнілася — напяваная ім прыпеўка:

*Я нікога не баюся:*
*Я на Фурцавай жанюся...*

Для сыскнога ведамства, пэўна, не былі сакрэтам і Сцяпанавы показкі. Часам прылюдна Сцяпан мог расказаць, напрыклад, такую з іх. Не ведаю, ці сам прыдумаў тое, ці ў народзе чуў, запісаў, запомніў. Прыблізна так помніцца, баянае Сцяпанам. «Каб сто азёр — у адно возера, а сто дубоў, што растуць над ім, — у адзін дуб. А сто пілаў — у адну пілу, і зрэзаць ёю той вялізны дуб — то атрымаўся б вялікі плюх!» Вядома, хтось дзе мог угледзець у гэтым немудрагелістым тэксце двухсэнсоўнасць, палічыць, што показка цэліць у аснову ідэалагічную міфалагему палітычнай сістэмы дзяржавы, дзе на словах будаваўся, ці ўжо нават быў пабудаваны, самы перадавы грамадскі лад, адзіна здольны ашчаслівіць усё чалавецтва.

Натуральна, пры нязвычным нашым сумоўі-субяседаванні ў мяне мільганула думка, што трэба неяк апраўдаць сябра перад службай, якая яўна збірае для чагось кампрамат. Кажу, што Міско — чалавек з гумарам. Ён такім сапраўды быў па натуры сваёй. Я гэта адчуў з першага нашага знаёмства.

Далей кажу, што часам мог быць не дастаткова сур'ёзным у сваіх выказваннях. Напамінаю, што ў вайну дапамагаў старэйшаму свайму брату-партызану ў зборы звестак пра ворага.

**З КДБ я выйшаў не запалоханы, але, вядома, азадачаны. Не прыйшло мне ў галаву суаднесці выклік у КДБ і сталы прэсінг з боку яго пры выданні маіх кніжак пра беларускіх вучоных і культурных дзеячаў**

Не помніцца, каб у мяне тым разам нешта пыталіся пра Міхася Чарняўскага. Можа, «кампраматных» ведамак аб ім ужо былі назбіралі. А можа, папросту пачуць патрэбнага ім ад мяне не спадзяваліся.

Пазней Міхась расказваў, што на допыт у КДБ яго забралі раніцай з дому. Па дарозе ў аўто ён — казаў пра тое з усмешкай — так разгаварыўся... Дазволіў сабе дыскутаваць з кадэбістамі?

Дастаўлены ў сядзібу Камітэта дзяржбяспекі, Міхась, калі яго спыталіся пра Ліса, мнагаслоўна пачаў распавядаць, як Ар.Ліс, апантаны паэзіяй Аляксандра Блока, прынагодна чытае напамяць яго вершы ды расказвае пра творчасць паэта. Тым самым Міхась падказваў сваім нязвычным апанентам, што яго сябра не які-небудзь нацыянальна абмежаваны таварыш: чытае ды прапагандуе не Янку Купалу, Максіма Багдановіча ці Алеся Гаруна, а рускага класіка.

Я сапраўды ў тую пару быў захоплены гэтым найвыдатнейшым з рускіх паэтаў-сімвалістаў, яго ўменнем перадаць у паэтычным слове імгненны душэўны рух-настрой. Падкупляла чаканнасць радкоў, строф Блокаўскай лірыкі, яе сэнсавая напоўненасць, метафорыка. Хоць бы ўзяць верш паэта пра сваё пакаленне:

*Рождённые в годы глухие,*
*Пути не помня своего,*
*Мы, дети страшных лет России,*
*Забыть не в силах ничего.*
*Испепеляющие годы,*
*Безумство ль в вас, благая весть?*
*От дней борьбы, от дней свободы*
*Кровавый отсвет в лицах есть.*

Або:
*Вновь весна без конца и без края.*
*Без конца и без края мечта.*
*Узнаю тебя, жизнь, принимаю*
*И приветствую звоном щита.*

Наша спецыфічнае «сумоўе», відаць, праслухвалася, фіксавалася дзесь у суседнім пакоі. Мой следчы, назавём яго прыблізна так, вяртаўся ад шэфа з нейкім новым пытаннем. Сам жа той не паказваўся. Толькі напрыканцы на хвіліну прыадчыніў быў дзверы, пэўна, каб зірнуць на дапытванага. Пасля зачыненых дзвярэй я выказаў яму камплімент: маўляў, аблічам нагадвае вядомага народнага артыста. Суразмоўнік мой ніяк не зрэагаваў на нетактоўнасць. Праўда, і на далей заставаўся дастаткова ветлівым, уважлівым.

На адыход, падаючы з вешалкі мой балоневы плашч, нечакана звярнуўся з пытаннем:

— Вы всегда разговариваете на белорусском языке?

— А што?.. Ужо не можна? — рэзка, заклапочана кажу яму.

— Нет, нет! Можно, — неяк узрушана заспяшаўся запэўніць мяне таварыш з Камітэту. І тут у працяг дыялогу «можна-няможна» я якась спантанна акрэсліваю сваю пазіцыю ў дачыненні да роднай мовы, права на яе:

— Сыну майму яшчэ крыху больш месяца. Падрасце — буду гаварыць з ім па-беларуску. Навучу, каб ведаў, помніў, хто мы і хто адвеку былі нашы дзяды-прадзеды.

— Правільно, правільно! — амаль горача, але не думаю, каб надта шчыра, падтрымаў мяне таварыш з Камітэту. Не тая задача стаяла тады перад ведамствам, той структурай, у якой ён працаваў.

***

Генсекам КПСС Мікітам Хрушчовым ужо былі канкрэтна абвешчаны час, дата, канчатковай пабудовы ў СССР камунізму. Агітпроп інфармаваў аб сфарміраванні на 1/6 частцы свету новай грамадскай супольнасці «савецкі народ».

Няўзнак, паволі праводзілася ідэя-падказка аб патрэбе пераходу пісьменнікаў саюзных і аўтаномных рэспублік у іх творчасці на рускую мову. Ідэя-думка аб пераходзе пісьменнікаў Саюза на адзін «общедоступный язык» і выклікала рэзанансную інвектыву знакамітага савецкага паэта Расула Гамзатава:

*...И если завтра мой язык исчезнет,*
*То я готов сегодня умереть!*

Верш аўтарытэтнага пісьменніка атрымаў шырокі водгук у асяроддзі творчай інтэлігенцыі ўсёй краіны. Згадваўся, цытаваўся ў палемічных выступленнях у друку і вусных.

Тым часам пераход на рускую дзе-нідзе пачаў практыкавацца. І гэта было як бы натуральна, лагічна. У камунізме людзі павінны будуць карыстацца адной мовай, здольнай маналітна яднаць аднародную людскую супольнасць у яе працы, жыцці. А як іначай?

На таго ж беларускага інтэлігента, які не разумеў агульнай ідэалагічнай дамінанты эпохі, можна было глянуць і не без падазрэння. Трымаецца мовы адно свайго народу — значыць, нязгодны з партыйна-дзяржаўнай дактрынай, устаноўкай на зліццё нацый, надыход эры камунізму?..

Думалася, згадвалася мне пра гэта, канешне ж, не тады, у восень 1973 года, калі выходзіў з дому на праспекце, адкуль гадамі вывозілі беларускіх людзей у клятую продкамі Сібір або адразу ў Курапаты.

***

З КДБ я выйшаў не запалоханы, без пачуцця прыгнечанасці, але, вядома, азадачаны. Не меў яснасці што да матывацыі выкліку і фактычна допыту. Падумалася, што можа дзеля прафілактыкі ўсё тое. Маўляў, будзеш ведаць, што ты ў нас на воку, пад кантролем. Паасцерагаешся. А папраўдзе, моцна не задумваўся.

Неяк не прыйшло мне ў галаву адразу суаднесці выклік у КДБ і сталы прэсінг з боку яго пры выданні маіх кніжак пра беларускіх вучоных і культурных дзеячаў.

Выдадзеная ў 1966 годзе першая мая кніжка «Браніслаў Тарашкевіч» была прыхільна прынятая навукоўцамі, пісьменнікамі і яшчэ пазасталымі ў жыцці былымі ўдзельнікамі нацыянальна-вызваленчага і рэвалюцыйнага руху колішняй Заходняй Беларусі. Апошнім постаць Тарашкевіча, арганізатара і кіраўніка стотысячнай Беларускай сялянска-работніцкай грамады 20-х гадоў, загубленага сталіншчынай, была асабліва блізкай, дарагой.

Пададзеную ў тое ж акадэмічнае выдавецтва маю заяўку на кніжку пра першага гісторыка і тэарэтыка беларускага мастацтва М.М.Шчакаціхіна на апошняй стадыі зацвярджэння плана выданняў галоўны рэдактар Георгі Юрчанка выкрасліў. Даведаўся аб тым ад выдавецкай супрацоўніцы, былой сваёй універсітэцкай аднакурсніцы.

Зварот да дырэктара выдавецтва Тадэвуша Савіцкага дапамог кнізе выйсці ў свет, дарэчы, пад навуковай рэдакцыяй акадэміка П.Ф.Глебкі.

Калі ж праз два гады паўтарылася такая ж гісторыя з маёй кніжкай «Пётра Сергіевіч» (мастаку, які яшчэ з заходнебеларускага перыяду плённа працаваў над творамі з гістарычнага мінулага Беларусі, споўнілася 70 гадоў, і быў час падзякаваць за створанае), то нечыноўны, у прынцыпе зычлівы Тадэвуш Савіцкі сказаў: «Браток, не магу. Ідзі вышэй...»

**Працяг будзе**

# Упершыню ў масавы пракат

Вольга ПУТРЫК

**Да 500-годдзя кнігадрукавання праект «Беларускія ўікенды» сумесна з velcom і «Атлант Тэлекам» ладзяць унікальную кінападзею.**

Упершыню на вялікія экраны ў беларускай агучцы выйдзе прэм'ерны фільм. Кінастужка будзе ісці ў шасці кінатэатрах Мінска на працягу амаль двух тыдняў, а ў лістападзе яе прэзентуюць у іншых гарадах Беларусі.

Для маштабнай прэм'еры быў абраны нідэрландскі фільм «Шторм: палаючы ліст». «Гэта найперш прыгодніцкая стужка. Аднак адсылкі да гістарычных фактаў, змешчаныя ў ім, не толькі фармуюць цікавы сюжэт, але і перагукаюцца з важнымі падзеямі нашай гісторыі — у прыватнасці, з 500-годдзем беларускага кнігадрукавання. Таму сімвалічна, што фільм, прысвечаны гэтым падзеям, упершыню на сучасным этапе развіцця беларускага кінапракату будзе прадстаўлены адразу ў беларускамоўнай агучцы», — адзначыў начальнік аддзела карпаратыўных камунікацый кампаніі velcom Вячаслаў Смірноў.

Прэм'ера фільма «Шторм: палаючы ліст» адбудзецца 27 кастрычніка. Кожнага гледача чакае не толькі цікавая гісторыя, але і прыемныя сюрпрызы, непасрэдным чынам звязаныя з двума вялікімі юбілеямі гэтага года: 500-годдзем Рэфармацыі і 500-годдзем беларускага кнігадрукавання.

Фільм «Шторм: палаючы ліст» будзе дэманстравацца з 27 кастрычніка па 8 лістапада 2017 года ў velcom cinema, Silver Screen у ГЦ Galileo і Arena City, а таксама «Аўроры», «Беларусі» і «Маскве».







# Yes, we Ken!

**«Амерыканка» сабрала грошы на выданне раману Кена Кізі «Палёт над гняздом зязюлі», перастворанага пабеларуску Аляксеем Знаткевічам.**

Перакладчыкі сабралі на платформе ulej.by амаль 6955 рублёў на друк і выплату аўтарскіх правоў.

Грошы паступілі ад 180 замоўцаў кнігі і ахвярадаўцаў. Самай вялікай пералічанай сумай сталіся 2000 рублёў ад мецэната Ігара Жабароўскага, які такім чынам зрабіўся галоўным спонсарам выдання.

«Палёт над гняздом зязюлі» выйдзе друкам у сярэдзіне лістапада ў выдавецтве «Янушкевіч». Удзельнікі краўдфандынгу змогуць забраць яго ў некалькіх кропках у цэнтры Мінска і атрымаюць эксклюзіўнае права быць першымі чытачамі беларускай версіі знакамітага раману. Старт продажаў запланаваны на першую палову снежня. Тады ж адбудзецца і вялікая прэзентацыя кнігі Кізі і ўсёй серыі «Амерыканка», а таксама шэраг падзеяў вакол кнігі як у Мінску, так і па-за яго межамі.

Паводле задумы стваральнікаў, «Амерыканка» аб'ядноўвае кнігі культавых пісьменнікаў Паўночнай Амерыкі пра свабоду і чалавечую годнасць. Апроч шэдэўру Кізі перакладзеныя на беларускую мову і чакаюць выдання яшчэ тры раманы: «Байцоўскі клуб» Чака Паланюка, «Чытво» Чарльза Букоўскага, «Пенелапіяда» Маргарэт Этвуд. Новая кампанія «Амерыканкі», падчас якой можна будзе замовіць гэтыя кнігі, распачнецца ў снежні.

Беларускія перакладчыкі дзякуюць усім чытачам, якія паверылі ў серыю і замовілі кнігу!

**Марыя Мартысевіч**







Новы час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
novychas.by

Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Колб Аксана Мікалаеўна**
Намеснік рэдактара **Пульша Сяргей Пятровіч**
Стыль-рэдактар **Пяроўская Святлана Віктараўна**

**ЗАРЭГІСТРАВАНА** Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл. (+375 17) 263 85 11.

**ВЫДАВЕЦ** Выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне ад 25.04.2014 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА** 220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234. Тэл. +375 17268-52-81; +375 29 625-57-51, novychas@gmail.com; novychas.by

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А. ЛП №02330/190 ад 30.04.2004. Замова №991

Падпісана да друку 20.10.2017. 8.00. Наклад 2000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў. Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая. Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.